Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 16 (28632)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Фінскі адукацыйны цуд**

СТАР. 4



**Маркі – летапіс дзяржавы**

СТАР. 8



**Як эмоцыі выклікаюць хваробы**

СТАР. 11

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КАРАГІН, старшыня ГА «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і работадаўцаў»:**

*«У Беларусі прыняты важныя дакументы па развіцці прадпрымальніцтва, знакавым з'яўляецца дэкрэт № 7. Неабходна ва ўсіх рэгіёнах краіны наладзіць эфектыўны дыялог дзяржаўных органаў і бізнес-супольнасці, вызначыць агульныя падыходы інтарэсаў. Гэта павінна быць не проста размова, а вырашэнне канкрэтных пытанняў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9779 | ▼ |
| Еўра | 2,4210 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0350 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0685 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X



ПРАКАВЕТНАЕ

# Каляда, Дуб і іншыя...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Кожны год дваццаць першага студзеня жыхары вёскі Новіны, што ў Бярэзінскім раёне, збіраюцца ў сельскім Доме культуры, каб урачыста і годна аддаць пашану аднаму з галоўных свят земляробчага календара — Калядам. Прыносяць з сабою стравы, ласункі, робяць «ката» з хлеба, сала і каўбасы. Але самае важнае ў гэтым звычаі — упрыгожыць жытнёвы альбо пшанічны сноп, які сімвалізуе Каляду, згатаваць куццю. З гэтымі вечнымі сімваламі працавітасці і роду адправіцца за вёску да дуба і прымацаваць іх сярод галін дрэва.**

СТАР. 5

■ Асоба

## Архімандрыт у кедах



**Насамрэч ён быў у зімовых красоўках. Ішоў сабе ў парку, дзе ў Гомелі знаходзяцца кафедральны сабор і епархія, і раптам зразумеў, што дзяўчынкі-школьніцы гучна разважаюць менавіта пра яго абутак. Відаць, ім хацелася, каб з-пад падрызніка выглядвалі лапці ці кірзавыя боты? Чаму нас больш хвалюе тое, што надзеў на ногі святар, чым стасункі з блізкімі людзьмі ці стан свайго душэўнага здароўя? Пытанні, якія баімся задаць, і пошук адказаў на іх — у разважаннях вядомага беларускага святара, які зусім нядаўна выдаў чарговую кнігу.**

Пісьменніцкі дар архімандрыта Савы (Мажукі), насельніка Гомельскага Свята-Мікольскага мужчынскага манастыра для грамадства адкрыўся не вельмі даўно. У 2014 годзе ў маскоўскім выдавецтве выйшла яго першая кніга «Любоў і пустэча». У канцы 2016 года — «Апельсінавыя святыя». І вось нарэшце адбылася прэзентацыя трэцяй: «Непазбежнасць Пасхі».

Між тым творы святара, сёння знакамітага яшчэ і шматлікімі відэавыступленнямі на тэлебачанні і ў інтэрнэце, — не прапаведзі ў іх класічным выглядзе. Хутчэй гэта блогі — скажуць тыя, хто прывык карыстацца сучаснай лексікай. Дарэчы, апошняя кніга спачатку існавала ў выглядзе асобных артыкулаў — разважанняў аўтара — на кожны дзень леташняга Вялікага посту на вядомым сайце http://www.pravmir.ru.

У гомельскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Герцэна, з якой архімандрыт супрацоўнічае даўно і цесна, ён, прадстаўляючы новае выданне, дзяліўся думкамі не толькі пра яго змест. Дарэчы, прыслухаемся.

СТАР. 9

■ Сацыяльная ініцыятыва

## ПАРК, ЯК У СІНГАПУРЫ

### «Хочам зрабіць Мінск горадам, зручным для ўсіх»

**У Мінску гэтай вясной з'явіцца Тэрапеўтычны парк для пенсіянераў. У ім будзе зона адпачынку са зручнымі лаўкамі і зона актыўнасці — месца для інтэлектуальных гульняў і пляцоўка, дзе можна будзе паказаць сябе ў якасці ландшафтнага дызайнера. Плануецца праводзіць у парку і аздараўленчыя праграмы з удзелам пажылых людзей, такія як навучанне скандынаўскай хадзе і практыкаванням на раўнавагу — для прафілактыкі падзенняў.**

СТАР. 7



# АПОРА Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ

**Беларусь як падтрымка для АБСЕ, як пляцоўка для згладжвання сусветных канфліктаў, як платформа для мірных перагавораў. Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абазначыў менавіта такую пазіцыю на сустрэчы са спецыяльным прадстаўніком Парламенцкай асамблеі АБСЕ па Усходняй Еўропе Кентам Харстэдам.**

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў спецпрадстаўніку за тое разуменне, якое ён праяўляе ў адносінах да нашай краіны, і запэўніў, што Беларусь будзе мець вельмі добрыя стасункі з арганізацыяй і гатова да абмеркавання любых праблем. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў замежнаму госцю задаваць уладам, прадстаўнікам дзяржаўных структур любыя патрэбныя пытанні.

— Умова адна — мы суверэнная, незалежная краіна, і як любая іншая краіна, як і ваша родная Швецыя, мы не можам пагадзіцца ці дапусціць, каб нас дзесьці штурхалі ў спіну, пануквалі намі, павучалі нас. Мы гатовы вучыцца. А вось павучаць — мы гэта ўспрымаем, яшчэ раз падкрэсліваю, як і любая іншая краіна, негатыўна, — сказаў беларускі лідар. — Што датычыцца еўрапейскай рэгіянальнай бяспекі — вы ведаеце наша стаўленне да многіх рэчаў, да многіх тэндэнцый у Еўропе. Вы ведаеце наша стаўленне да пытанняў бяспекі, вайны і міру. Мы і надалей будзем прытрымлівацца гэтай пазіцыі. І паверце, для АБСЕ мы будзем добрай апорай тут, у цэнтры Еўропы, і будзем рабіць усё, каб у нашым агульным еўрапейскім доме былі мір і парадак.

Прэзідэнт заклікаў тэрмінова ажыццявіць дзеянні, каб негатыўная тэндэнцыя, якая характарызуе напружанасць у Еўропе, была зніжана. Як варыянт правядзенне ў Беларусі «Хельсінкі-2», падчас якіх вядучыя краіны планеты, што ўваходзяць у АБСЕ, селі б за стол перагавораў і абмеркавалі б далейшыя дзеянні па зніжэнні напружанасці на Еўрапейскім кантыненце.

**Кент ХАРСТЭД, спецыяльны прадстаўнік Парламенцкай асамблеі АБСЕ па Усходняй Еўропе:**

— Беларусь мае добрыя магчымасці для прасоўвання розных ініцыятыў. Што датычыцца «Хельсінкі-2», то тут не без цяжкасцяў, таму што ёсць шмат розных меркаванняў, якія датычацца пачатку такога працэсу. Напэўна, на цяперашнім этапе ў многіх сталіцах іншых дзяржаў разважаюць над гэтай ініцыятывай.

Кент Харстэд у нашай краіне не першы раз. «Павінен прызнаць, што я вельмі прыязна стаўлюся да вашай краіны і да вашага народа. І, азіраючыся на мінулы год, я хацеў бы ў першую чаргу падзякаваць вам за правядзенне летняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Гэта было яскрава праведзенае мерапрыемства з добрым вынікам для ўсіх нас», — адзначыў ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

# ПАДРЫХТОЎКА ДА КРАСАВІКА

**У Мінску сустрэнуцца члены Савета пастаянных прадстаўнікоў СНД**

**У наступны аўторак беларуская сталіца прыме гасцей з усёй постсавецкай прасторы. Першае ў гэтым годзе пасяджэнне Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД пры статутных і іншых органах Садружнасці адбудзецца 30 студзеня.**

Члены Савета сфарміруюць праект парадку дня чарговага пасяджэння Савета міністраў замежных спраў СНД, якое адбудзецца ў Мінску 6 красавіка. У прыватнасці, у яго ўключаны пытанні палітычнага ўзаемадзеяння, дакументы, якія датычацца супрацоўніцтва ў барацьбе са злачынствамі ў сферы інфармацыйных тэхналогій, супрацьдзеяння легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарызму і распаўсюджвання зброі масавага знішчэння. Кіраўнікам знешнепалітычных ведамстваў будуць таксама прадстаўлены праекты дакументаў у галіне адукацыі і маладзёжнай палітыкі.

Таксама плануецца абмеркаваць перспектывы развіцця дагаворна-прававой базы СНД у бягучым годзе і ўзгадніць кандыдатуры кіраўнікоў місій назіральнікаў ад інтэграцыйнага аб'яднання на выбарах прэзідэнта Расіі і дэпутатаў парламента Туркменістана. У пасяджэнні прыме ўдзел старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей Лебедзеў.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■ Дзяржава і бізнес

# Колькасць рамеснікаў расце

**А з 12 студзеня сёлета гэтыя «адзіночкі» працуюць па новых правілах. З важных змяненняў — ім дазволілі не рэгістраваць ІП, гандляваць у майстэрнях і рэкламавацца ў інтэрнэце**

**Дарэчы, з 2005 года колькасць фізічных асоб, якія выплачваюць збор за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці, вырасла ў краіне больш чым у сто разоў, адзначылі ў Мінэканомікі. Дадзеная дынаміка працягваецца і цяпер. На 1 студзеня 2018 года збор за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці заплацілі 29 381 чалавек, як паведамілі ў Мінэканомікі. Для параўнання: на аналагічны перыяд мінулага года іх было 23 359 чалавек.**

Больш за ўсё рамеснікаў на пачатак гэтага года было ў Мінску — 6674 чалавекі. На другім месцы па гэтым паказчыку знаходзіцца Брэсцкая вобласць (5055), а на трэцім — Віцебская (3780). Менш за ўсё «саматужнікаў» на пачатак гэтага года было ў Мінскай вобласці — 3375 чалавек. «Больш за 70 % рамеснікаў знаходзіцца ў рэгіёнах», — адзначылі ў Мінэканомікі.

Прынамсі, рамеснікі не выплачваюць падаходны падатак і адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб, а таксама не вядуць дзяржаўную статыстычную справаздачнасць, могуць самастойна выплачваць узносы ў фонд сацабароны.

Для рамеснікаў таксама пашырылі спіс відаў дзейнасці, якія можна ажыццяўляць па заяўным прынцыпе без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. У спіс уключылі, напрыклад, усе віды творчасці, якія ажыццяўляюцца на аснове ручной працы. «Саматужнікам», да таго ж, дазволілі браць вучняў на навучанне сваёй дзейнасці. Але існуе абмежаванне: адначасова можна навучаць не больш за тры чалавекі. Раней можна было навучаць толькі аднаго чалавека. Пры гэтым тэрмін навучання не можа перавышаць два гады.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ЦРУ НАЗВАЛІ ТЭРМІНЫ ЯДЗЕРНАГА ЎДАРУ КНДР ПА ЗША

Дырэктар ЦРУ Майк Пампеа ў эфіры тэлеканала CBS заявіў, што Паўночнай Карэі спатрэбіцца «некалькі месяцаў», каб падрыхтаваць ядзерны ўдар па ЗША. Гэта час, за які КНДР зможа назапасіць неабходны патэнцыял. Часопіс Newsweek, каментуючы словы Пампеа, адзначае, што факт валодання Пхеньянам магчымасцю нанесці ўдар па мацерыковай часткі ЗША не азначае, што гэта сапраўды адбудзецца праз «некалькі месяцаў».

## ДЖОРДЖ ВЕА АФІЦЫЙНА ЎСТУПІЎ НА ПАСАДУ ПРЭЗІДЭНТА ЛІБЕРЫІ



Легендарны футбаліст Джордж Веа, які атрымаў перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у Ліберыі, афіцыйна ўступіў на пасаду кіраўніка дзяржавы. Цырымонія інаўгурацыі, сярод ганаровых гасцей якой была спецыяльная дэлегацыя ФІФА, прайшла на стадыёне ў сталіцы Ліберыі Манровіі. Цяперашняя змена ўлады ў краіне — першая з 1944 года, якая адбываецца дэмакратычным шляхам. Веа атрымаў перамогу ў другім туры выбараў, які прайшоў 26 кастрычніка, атрымаўшы 61,5 % галасоў. Падчас сваёй перадвыбарчай кампаніі ён паабяцаў змагацца з галечай, высокім узроўнем беспрацоўя і карупцыяй.

## БЕРЛУСКОНІ ВЯРТАЕЦЦА Ў ВЯЛІКУЮ ПАЛІТЫКУ

Былы італьянскі прэм'ер Сільвіё Берлусконі вярнуўся ў вялікую палітыку. У Брусэлі ён запэўніў кіраўніцтва ЕС: у выпадку перамогі на выбарах яго партыя «Наперад, Італія!» будзе падзяляць прынцыпы і праграму іншых еўрапейскіх кансерватараў. Сільвіё Берлусконі сустрэўся з генеральным сакратаром Еўрапейскай народнай партыі Антоніа Лопэсам Істурысам і Мішэлем Барнье, галоўным перамоўшчыкам ЕС па «брэксіце». Таксама ён правёў сустрэчы са старшынёй Еўракамісіі Жан-Клодам Юнкерам і яго намеснікам Антоніа Таяні, абмеркаваўшы з тым праблему міграцыі, у прыватнасці, меры па яе скарачэнні шляхам узмацнення жорсткасці памежнага кантролю. Міграцыйны крызіс зрушыў палітычныя перавагі італьянцаў управа, і шанцы на перамогу партыі «Наперад, Італія!» вялікія. Сам Берлусконі, праўда, не мае права займаць дзяржаўныя пасады, але вось адыграць вырашальную ролю ў прызначэнні прэм'ер-міністра здолее.

## У КІТАІ ВЫКРЫЛІ НАЙБУЙНЕЙШУЮ Ў СВЕЦЕ ФІНАНСАВУЮ ПІРАМІДУ



Кітайскія ўлады спынілі работу найбуйнейшай у гісторыі краіны фінансавай піраміды Qbao, якая, цалкам верагодна, стала і самай маштабнай у гісторыі чалавецтва, паведамляе Asia Times. Qbao (ад кіт. Qianbao — «скарб») абяцала прыбытак у памеры да 80 % гадавых і змагла прыцягнуць каля 200 млн кліентаў. Заснавальнік кампаніі Чжан Сяалу сам здаўся паліцыі незадоўга да Новага года. Яго падазраюць у незаконным прыцягненні ад інвестараў 70 млрд юаняў (11 млрд долараў). Qbao дзейнічала па прынцыпе класічнай схемы: грошы і працэнты старым інвестарам выплачваліся за кошт сродкаў новых укладчыкаў. Праца сайта кампаніі была спынена яшчэ ў канцы мінулага года, калі ён стаў настолькі папулярны, што прыцягваў да 2 млн новых карыстальнікаў штодня. Зараз усе зарэгістраваныя на Qbao рахункі замарожаныя. Укладчыкі піраміды адмаўляюцца верыць у тое, што здарылася, і лічаць трагічнай памылкай арышт Чжана, вядомага ў Кітаі як «гуру інвестыцый». Калі абвінавачанні пацвердзяцца, яму можа пагражаць пажыццёвае зняволенне.

■ Погляд



# ТОП-7 ВЫКЛІКАЎ:

## што чакаць сёлета ад міжнародных адносін

**Навагодні настрой усяляў пазітыў, але 2018 год уступіў у законныя правы, таму неабходна аналізаваць, якія выклікі ён можа прынесці і як нам на іх рэагаваць.**

**Першым па значэнні** для Беларусі з'яўляецца ўкраінскі крызіс. Ад яго развіцця многае залежыць. Пры гэтым галоўнымі для Беларусі з'яўляюцца два кірункі: развіццё ваеннай сітуацыі на ўсходзе Украіны і стабільнасць краіны ў цэлым. Найбольшыя рызыкі дэстабілізацыі ў ваеннай сферы прыпадаюць на прэзідэнцкія выбары ў Расіі. Калі гэты перыяд удасца прайсці спакойна, то рызыкі зменшацца. Што датычыцца стабільнасці краіны ў цэлым, то з ёй усё будзе інакш — рызыкі будуць нарастаць з кожным месяцам. Справа ў тым, што краіна рухаецца да прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў 2019 года, маецца вялікі шанц спроб дабіцца датэрміновых выбараў з боку асобных сіл, якія рвуцца да ўлады. Пры гэтым у ход могуць пайсці не зусім цывілізаваныя аргументы.

**На другім месцы** па значэнні для Беларусі выступае стабільнасць сусветнай эканомікі. Еўрасаюз усё бліжэй да выхаду Вялікабрытаніі з арганізацыі, на сусветным рынку шмат дысбалансаў, і ўжо занадта даўно стабільна растуць цэны акцый на заходніх біржах. На гэта накладваецца сітуацыя з сусветнай палітычнай сістэмай, якая ўсё больш разладжваецца і рызыкі ў якой пастаянна павялічваюцца з-за растучых супярэчнасцяў паміж цэнтрамі сілы. Набірае сілу пратэкцыянізм, што цягне рызыкі для эканомік, арыентаваных на экспарт, да ліку якіх адносіцца і Беларусь.

**На трэцім месцы** — развіццё сітуацыі з эканомікай у ЕАЭС. У 2017 годзе аднавіўся эканамічны рост на ўсёй тэрыторыі, ахопленай працэсамі еўразійскай інтэграцыі. Галоўнае пытанне ў тым, наколькі стабільны ён будзе далей, ці ўдасца перасягнуць параметры 2017 года? Як будзе развівацца расійская эканоміка, якая з'яўляецца галоўным рынкам збыту беларускіх тавараў? Ці атрымаецца прыйсці да новых важных пагадненняў, выгадных для Беларусі?

**На чацвёртым месцы** — рызыкі, звязаныя з лёсам адносін Захаду з КНДР. Пазітыўныя сігналы аб гатоўнасці да перагавораў з боку КНДР могуць быць успрынятыя Захадам як прызнанне слабасці, з-за чаго ён можа падвоіць намаганні, каб дабіць праціўніка, які паказаў слабіну. Калі ўлічыць вялізную армію Паўночнай Карэі і, што больш важна, ядзерную зброю, у выпадку неабдуманых рашэнняў свет можа дорага заплаціць за надта агрэсіўную стратэгію Вашынгтона. Рызыкі павялічваюцца тым, што прэзідэнт ЗША Дональд Трамп мала што разумее ў азіяцкай спецыфіцы і імкнецца вырашаць усе праблемы ў каўбойскім стылі. Такая ж тактыка з боку Джорджа Буша-малодшага прынесла свету нямала сур'ёзных праблем.

**На пятым месцы** рызыкі, звязаныя з сітуацыяй вакол Ірана. У 2015 годзе асноўныя пытанні да Ірана з боку Захаду былі ўрэгуляваны ў выніку пагаднення. Дональд Трамп спрабуе гэтае пагадненне перагледзець. На фоне нядаўніх пратэсных выступленняў у Іране ўрад не можа ісці яму насустрач, таму што гэта можа быць расцэнена ў краіне як слабасць і выклікаць ужо сур'ёзную дэстабілізацыю. У выніку, калі па патрабаванні Дональда Трампа ЗША выйдуць з пагаднення 2015 года, можа аднавіцца ранейшая нестабільная сітуацыя да 2015 года — Іран адновіць сваю ядзерную праграму, што выкліча рост супярэчнасцяў у рэгіёне, дзе і так праблем хапае.

**На шостым месцы** па значэнні сірыйскі і іракскі крызісы. У 2017 годзе намаганнямі Расіі на сірыйскай тэрыторыі і намаганнямі Захаду на іракскай удалося разграміць тэрарыстычную групоўку «Ісламская дзяржава». Але здавацца яна не збіраецца. У тэрарыстаў па-ранейшаму ёсць дзясяткі тысяч трэніраваных баевікоў, частка з якіх перайшла на нелегальнае становішча, а частка спрабуе ўзяць рэванш. Пры гэтым рызыкі для Еўразіі дадае тое, што яшчэ адна частка, якая навучылася за гады вайны справе тэрору, пачынае раз'язджацца па ўсёй Еўразіі ў пошуках ціхага месца, дзе можна нейкі час аднавіць свае сілы, а потым узяцца за старое. Спадзявацца, што поўны разгром «Ісламскай дзяржавы» на тэрыторыі Сірыі і Ірака прывядзе да поўнай ліквідацыі групоўкі, не прыходзіцца. Яна стане яшчэ адной Аль-Каідай, сеткавай структурай, якая мае дзясяткі тысяч баевікоў па ўсёй планеце і якая шукае магчымасці забіваць.

**На сёмым месцы** будзе сітуацыя ў ЕС. 2017 год упершыню даў надзею, што эканоміка Еўрасаюза пачынае апрытомніваць пасля крызісу 2008 года. Высокія тэмпы росту, якія перавысілі два працэнты ў 2017 годзе, пачынаюць нагадваць сітуацыю паспяховага перыяду да сусветнага фінансавага крызісу. Было б вельмі нядрэнна, калі б эканоміка ЕС захавала высокія тэмпы і ў 2018 годзе, а сітуацыя з Брэксітам не нашкодзіла пазітыўнай дынаміцы. Калі яна працягнецца, у нас з'явяцца шанцы павысіць тэмпы росту беларускай эканомікі, перасягнуўшы вынікі 2017 года.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Напярэдадні падзеі

# КНІЖНЫ ЧАС

## Ганаровы госць мінскай міжнароднай выстаўкі — Сербія

**Час правядзення XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу крыху скарэктаваны — сёлета яна адбудзецца з 28 лютага па 4 сакавіка. Галоўная тэма выстаўкі акрэслена так: «Беларусь — культурная пляцоўка Еўропы».**

Як адзначаюць у Міністэрстве інфармацыі, гістарычна склалася так, што Беларусь з'яўляецца гасціннай краінай, дзе можна пазнаёміцца з культурай, звычаямі многіх народаў. Тут дружна жывуць прадстаўнікі многіх нацыянальнасцяў, іх культурнае багацце служыць узаемнаму ўзбагачэнню. Такая ж дзяржаўная палітыка праводзіцца і ў дачыненні да народаў іншых дзяржаў, для якіх наша краіна стала прыкладам міралюбнасці, талерантнасці, міжнацыянальнага братэрства.

Ганаровым госцем міжнароднай выстаўкі-кірмашу стане Сербія, цэнтральным экспанентам — Казахстан. Дарэчы, у розныя гады ганаровымі гасцямі тут выступалі Расія, Украіна, Ізраіль, Казахстан, Францыя, Германія, Венесуэла, Кітай, Арменія, Вялікабрытанія.

У праграме ўдзелу ганаровага госця запланавана выстаўка Нацыянальнай бібліятэкі Сербіі «Сербская літаратура ў Першай сусветнай вайне». Пройдуць творчыя сустрэчы з вядомым сербскім празаікам Горанам Петравічам, Даянай Лазаравіч — перакладчыцай на сербскую мову зборніка Максіма Багдановіча «Вянок». Адбудзецца сербска-беларуская літаратурная сустрэча «Творчы і навуковы тандэм: Іван Чарота і Драган Лакічавіч».

Будуць арганізаваны прэзентацыі выдадзенага ў Беларусі зборніка сучаснай сербскай паэзіі, кнігі Невены Віташавіч-Чэкліч «Чырвоныя кветкі Косава поля», кнігі «Беларусы пра Сербію і Югаславію», перакладу на рускую мову твораў св. Савы Сербскага «Студзенічкі ціпік» і «Жыцце св. Сімяона», падборкі беларускай паэзіі ў сербскім часопісе «Повельэ» і сербскіх выпускаў часопісаў «Маладосць», «Полымя», «Нёман», газеты «Літаратура і мастацтва». У Доме дружбы адбудзецца вечар, прысвечаны сербскай літаратуры.

Таксама чакаецца шырокі ўдзел у выстаўцы кнігавыдаўцоў з Расіі (экспазіцыі «Выдавецкія праграмы ўрада Масквы» і «Санкт-Пецярбургскі міжнародны кніжны салон»), Германіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Знакавым мерапрыемствам выстаўкі стане прэзентацыя «Энцыклапедыі Кітая» на беларускай мове. Праект рэалізаваны ў адпаведнасці з мемарандумам аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам інфармацыі Беларусі і Галоўным дзяржаўным упраўленнем па справах прэсы, выдавецтваў, радыёвяшчання, кінематаграфіі і тэлебачання КНР.

Камітэт па друку і ўзаемадзеянні са СМІ ўрада Санкт-Пецярбурга пакажа ў Мінску музычна-літаратурны вечар, прысвечаны 315-годдзю з дня заснавання горада на Няве і сумесным расійска-беларускім кніжным праектам.

У дні выставы пройдзе IV Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». Сваю згоду на ўдзел у сімпозіуме пацвердзілі пісьменнікі з больш як 20-ці краін.

На выстаўцы ўзнагародзяць пераможцаў конкурсу маладых літаратараў «Першацвет». Творчасці маладых аўтараў будзе прысвечана і прэзентацыя зборніка «Першацвет», выпушчанага па выніках конкурсу, а таксама кнігі маладога аўтара Станіславы Умец «Сэрца Сакры: фэнтэзі», якая адкрыла новую серыю выдавецтва «Мастацкая літаратура» «Час XXI».

На нацыянальным стэндзе Беларусі ў дні работы выстаўкі будуць арганізаваны шматлікія сустрэчы з аўтарамі, выдаўцамі, мастакамі, прэзентацыі новых кніг, круглыя сталы, аўтограф-сесіі. Тут жа пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў 57-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі».

Выстаўка пройдзе ў выставачным цэнтры «БелЭкспа» па адрасе: праспект Пераможцаў, 14. Запрашаем усіх ахвотных!

**Варвара ГОМАН**

■ Ва ўрадзе

# Больш інавацый і прарыўных праектаў

## Як выйсці на шосты тэхналагічны ўклад?

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ пакрытыкаваў недастатковую колькасць інавацыйных праектаў 5-га і 6-га тэхналагічных укладаў у агульным аб'ёме дзяржпраграмы інавацыйнага развіцця на 2016—2020 гады. Падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, дзе абмяркоўвалася рэалізацыя гэтай дзяржаўнай праграмы, кіраўнік урада адзначыў, што доля такіх праектаў павінна складаць не менш за 75 %.**

Як паведаміў Андрэй Кабякоў, у ліку тых праектаў, што зараз рэалізуюцца ў рамках дзяржпраграмы, толькі 34 з іх (39,5 %), адпавядаюць узроўню актуальных тэхналагічных укладаў. Па словах кіраўніка ўрада, прасочваецца слабая работа рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання па пошуку і рэалізацыі прарыўных інавацыйных праектаў, якія б адпавядалі патрабаванням сучасных тэндэнцый развіцця.

Усяго ж у рамках дзяржпраграмы 17 заказчыкаў рэалізоўць 86 праектаў. Найбольшая колькасць інавацыйных праектаў летась рэалізоўвалі Мінпрам — 13, Нацыянальная акадэмія навук — 10, канцэрн «Беллегпрам», а таксама аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам. Пры гэтым прэм'ер-міністр адзначыў недастатковую работу асобных заказчыкаў, што не дазволіла забяспечыць увод у эксплуатацыю аб'ектаў па шасці праектах дзяржпраграмы ва ўстаноўленыя тэрміны. «З-за невыканання таго, што было запланавана, трэба рабіць карэкціроўку праграмы ў частцы пераносу тэрмінаў і аб'ёмаў фінансавання, што не можа не адбівацца на эфектыўнасці праграмы ў цэлым», — дадаў прэм'ер-міністр.

Таксама Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што летась пры поўным асваенні сродкаў рэспубліканскага цэнтралізаванага інавацыйнага фонду не цалкам выкарысталі сродкі мясцовых інавацыйных фондаў — усяго 68,5 %. Найбольш праблемнымі ў гэтым пытанні з'яўляюцца Гродзенская (асваенне склала 33,6 %), Мінская (26,1 %) і Брэсцкая (63,5 %) вобласці. Па астатніх рэгіёнах асваенне сродкаў склала 80—93 %. Кіраўнік урада лічыць, што аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам для асваення гэтых сродкаў у поўным аб'ёме былі прыняты недастатковыя меры. Паводле слоў прэм'ер-міністра, сёлета пры поўным асваенні сродкаў інавацыйных фондаў і пры наяўнасці новых прарыўных праектаў, якія адпавядаюць узроўню 5-га і 6-га тэхукладаў, магчыма выйсці з ініцыятывай да Прэзідэнта аб павелічэнні працэнта адлічэнняў у інавацыйныя фонды. Цяпер яны складаюць 10 % ад падатку на прыбытак. «Магчыма павелічэнне гэтага нарматыву да 15—20 %, — рэзюмаваў Андрэй Кабякоў. — Такія падыходы будуць садзейнічаць прыцягненню дадатковых сродкаў і на развіццё навукі».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

# «МЯККАЯ СІЛА» ДОМА ДРУЖБЫ

**Напрыканцы мінулага стагоддзя слоўнік міжнародных адносін узбагаціў тэрмін «мяккая сіла» (англ. Soft power). Яго з'яўленне ў пэўным сэнсе адлюстроўвала месца і ўзрастаючую ролю, узмацненне ўплыву такіх «мяккіх» інструментаў уздзеяння на замежную грамадскасць, як нацыянальныя традыцыі і айчынныя культурныя каштоўнасці. Калі зыходзіць з сутнасці гэтага паняцця, то Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі (яго сядзібу для скарачэння часта называюць Домам дружбы) можна лічыць у пэўным сэнсе слова міністэрствам народнай дыпламатыі. Яно ўносіць важкі ўнёсак у развіццё добрасуседства і паразумення паміж беларускім і іншымі народамі.**

Што ўяўляе сёння гэта грамадская арганізацыя? Паводле слоў яе **кіраўніка Ніны ІВАНОВАЙ**, гэта — больш як 1000 паплечнікаў, якія аб'яднаны ў 40 таварыстваў дружбы з асобнымі краінамі, шасці абласных і Мінскае гарадское аддзяленні. Іх акцыі і мерапрыемствы, з аднаго боку, даюць магчымасць больш глыбока знаёміць грамадскасць Беларусі з гісторыяй, культурай і сучасным становішчам у замежных краінах, а з другога — наводзіць масты дружбы, садзейнічаць прысутнасці беларускай культуры ў сусветнай прасторы. Дарэчы, краінавыя таварыствы дружбы ўзначальваюць вядомыя і аўтарытэтныя ў краіне людзі. Сярод іх кіраўнік Пріорбанка Сяргей Касцючэнка — старшыня таварыства «Беларусь—Аўстрыя». Эдуард Зарыцкі — кампазітар, народны артыст, старшыня таварыства «Беларусь—Канада». Міністр інфармацыі Алесь Карлюкевіч узначальвае таварыства «Беларусь—Таджыкістан» і г. д.

На рахунку краінавых таварыстваў сотні добрых і карысных для краіны спраў. Назавём толькі некалькі асобных. Возьмем таварыства «Беларусь—Кітай». Яго актывісты пры падтрымцы пасольства КНР у Беларусі пастаянна знаёмяць мінчан з гісторыяй, традыцыямі, музыкай і танцамі, народнай кухняй і мастацтвам Кітая. Вылучаюцца мерапрыемствы па эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Кітая. Гэта канферэнцыі і круглыя сталы па развіцці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, новым курсе кітайскай дыпламатыі, ролі Індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

З Еўропай таксама наладжаны плённыя сувязі. У Германіі пры падтрымцы фонду «Дзецям Чарнобыля» зямлі Ніжняя Саксонія прайшлі Дні Беларусі з удзелам дэлегацыі таварыства «Беларусь—Германія», пасольства Беларусі ў ФРГ і балета Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. У рамках Дзён культуры ў дзевяці нямецкіх гарадах адбыліся канцэрты гэтага калектыву, экспанавалася тэматычная выстаўка, падрыхтаваная нямецкім фотамастаком Р. Любрыхтам. У такім жа фармаце ў Мінску і Магілёве былі праведзены Дні Германіі ў Беларусі.

Прыкладам паспяховага аб'яднання намаганняў розных арганізацый у паглыбленні ведаў пра культурны і духоўны свет краін-партнёраў застаецца дзейнасць таварыства «Беларусь—Аўстрыя», якое сумесна з аўстрыйскімі партнёрамі сістэмна праводзіць двухбаковыя Дні культуры і навукі. Мінск штогод наведвае дэлегацыя таварыства «Аўстрыя—Беларусь» пад кіраўніцтвам яго старшыні прафесара Петэра Бахмаера, якая прымае ўдзел у краіназнаўчых семінарах для студэнтаў і вучняў мінскіх навучальных устаноў. Яго ўдзельнікі чыталі лекцыі аб гісторыі, геаграфіі, літаратуры і асаблівасцях нямецкай мовы ў Аўстрыі. Пасля семінараў усе маюць магчымасць паслухаць аўстрыйскую музыку ў выкананні беларускіх музыкантаў.

Асобная і вялікая тэма — ажыццяўленне гуманітарнай праграмы БелТД. Усяго адзін яскравы факт. У выніку супрацоўніцтва з фондам «Дзецям Чарнобыля» зямлі Ніжняя Саксонія за справаздачны перыяд медыцынскім установам Беларусі перададзены праз БелТД 21 апарат ультрагукавой дыягностыкі, а ўсяго за 25 гадоў работы з Фондам — больш за 260 такіх апаратаў! Штогод з удзелам Фонду праводзяцца семінары па павышэнні кваліфікацыі беларускіх урачоў.

Працягваецца работа па аздараўленні дзяцей з забруджаных тэрыторый Беларусі. За перыяд з 2013 па 2017 год БелТД накіравала на аздараўленне 1056 дзяцей.

На што збіраюцца цяпер звярнуць увагу члены арганізацыі? Па-першае, па магчымасці максімальна ўдзельнічаць у міжнародных праектах па далейшым стварэнні станоўчага іміджу Беларусі за мяжой, прэзентацыі яе турыстычных магчымасцяў з акцэнтам на маючыя адбыцца ў 2019 годзе ў Мінску II Еўрапейскія гульні.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА**

# У ДЗЕНЬ СТУДЭНТА — НА ЛЫЖНЮ!

## Спартыўнае свята «Канікулы ў Лагойску» пройдзе 25 студзеня ў БДУ

**Акцыя ладзіцца на базе гарналыжнага спартыўна-аздараўленчага комплексу «Лагойск». Яе ўдзельнікамі стануць больш за 500 навучэнцаў, выкладчыкаў і работнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

Падзея прымеркаваная да святкавання Тацццянінага дня — нефармальнага свята студэнтаў, бо менавіта святая Таццяна лічыцца апякункай студэнцкай моладзі.

У праграме «Канікул у Лагойску» запланавана лыжная эстафета каманд рэктарата, прадстаўнікоў духавенства, дэканаў, работнікаў і студэнтаў БДУ. У гэты дзень на пляцоўках спартыўна-аздараўленчага комплексу будуць працаваць зоны актыўнасці, дзе ўсе ахвотныя змогуць паспрабаваць свае сілы ў сумо, атракцыёне «вялікі футбол», цiры і г. д. Акрамя таго, для ўдзельнікаў мерапрыемства пройдуць шматлікія розыгрышы і конкурсы. Ключавой падзеяй зімовага свята стане катанне на горных лыжах, сноўбордзе, цюбінгах і г. д.

А ў якасці сюрпрызу для студэнтаў падрыхтавана сустрэча з майстрам спорту міжнароднага класа, двухразовым бронзавым прызёрам чэмпіянату свету, чэмпіёнкай Еўропы, 11-кратнай чэмпіёнкай свету па летнім біятлоне Вольгай Назаравай.

Арганізатарам мерапрыемства выступіла Першасная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПЛАВАЦЬ РАНЕЙ, ЧЫМ ХАДЗІЦЬ





У 4-ю мінскую гарадскую клінічную паліклініку нават у маразы з задавальненнем прыходзяць мамы з дзеткамі — менавіта тут немаўляты з трох месяцаў асвойваюць навыкі плавання і ныряння. Адны заняткі — трыццаць хвілін. Разам з мамамі дзеткі плаваюць да трох гадоў, пасля — выключна з інструктарам. Спецыялісты лічаць, што ранняе плаванне — гэта выдатны спосаб умацавання здароўя з пялёнак. Менавіта таму маладыя бацькі разам з малымі з задавальненнем наведваюць басейн.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

# Сакрэты фінскага адукацыйнага цуду: АЎТАНОМІЯ, ДАВЕР, ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І РОЎНАСЦЬ

**У Фінляндыі школьная форма — гэта джынсы і худзі (талстоўка), прычым так апранаюцца там не толькі дзеці, але і педагогі. Усё вельмі неафіцыйна. Вучні звяртаюцца да сваіх настаўнікаў па імені. Сітуацыя, калі на ўроку гаворыць толькі педагог, немагчымая. Школьнікаў не прымушаюць запамінаць мноства інфармацыі, якую без праблем можна знайсці ў інтэрнэце, затое вучаць, як яе шукаць. У адной школе вучацца дзеці з самых розных сем'яў, незалежна ад іх даходаў, і, канешне, дзеці мігрантаў. У краіне практыкуецца тэрытарыяльны прынцып замацавання за ўстановай адукацыі — рынку школ не існуе. Ва ўсіх без выключэння навучальных установах для дзяцей ствараюцца аднолькавыя ўмовы. Галоўны прынцып — роўныя стартавыя магчымасці для ўсіх. Прыватная школа ў краіне толькі адна, прычым разлічана яна на дзяцей бізнесменаў і дыпламатаў, якія вымушаны часта змяняць месца жыхарства (з улікам гэтай спецыфікі там дзейнічае міжнародная праграма). Пра асаблівасці фінскай сістэмы школьнай адукацыі, якая зарэкамендавала сябе як адна з самых паспяховых у свеце, расказаў падчас свайго майстар-класа ў Мінску незалежны кансультант у сферы адукацыі Кары ЛАЎХІВУОРЫ.**

## НЕ РОК-ЗОРКА, А ПЕДАГОГ

Кары мае саракагадовы педагагічны досвед, прычым больш як 30 гадоў ён узначальваў школу, якая стала сімвалам фінскага адукацыйнага цуду. Паўтара года таму ён пакінуў свой пост і з таго часу стаў своеасаблівым паслом фінскай адукацыі. У Беларусь яго запрасіла кампанія «А-100 Дэвелопмент», якая збіраецца ўзводзіць у мікраёне Новая Баравая «школу будучыні». Для таго каб умясціць усіх ахвотных паслухаць фінскага педагога, давялося арандаваць канцэртную залу «Мінск». Прычым геаграфія ўдзельнікаў не абмяжавалася сталіцай — на сустрэчу зарэгістраваліся педагогі і дырэктары школ з усіх абласных цэнтраў і з шэрагу райцэнтраў. Добраахвотна, пасля працоўнага дня ў вячэрні час яны прыехалі ў Мінск, каб знайсці адказы на свае пытанні ці пацвярджэнне сваім думкам. І, напэўна, знайшлі, бо неаднаразова выступленне госця перарывалася апладысментамі...

**Фіны ўпэўнены, што ў дзяцей нельга адбіраць дзяцінства. Менавіта таму ніхто не падганяе дзяцей з вучобай і не патрабуе, каб малыя, якія прыходзяць у першы клас, умелі чытаць і лічыць.**

— Я ўражаны! Столькі людзей, быццам бы я рок-зорка, але насамрэч я звычайны настаўнік. Вы, напэўна, не туды трапілі, — пажартаваў Кары. — У мяне часта пытаюцца, у чым заключаецца сакрэт фінскай сістэмы адукацыі? Адказваю: кароткі школьны дзень, шмат перапынкаў для гульняў, мала хатніх заданняў і доўгія канікулы. Вы думаеце, што я зноў жартую? Але тое, што я сказаў, сапраўды вельмі блізка да праўды...

## ПРЭСТЫЖНАЯ ПРАФЕСІЯ

Сур'ёзна пра неабходнасць рэфармавання школы ў Фінляндыі задумаліся ў 70-я гады XX стагоддзя.

— У нас няма, напрыклад, нафты, як у Нарвегіі. Так, у нас ёсць лес, але ж мы не можам бясконца прадаваць «зялёнае золата». Таму вырашылі зрабіць стаўку на адукацыю, якая павінна стаць нашым моцным бокам, — тлумачыць Кары. — З гэтай прычыны вельмі шмат намаганняў было прыкладзена і для падрыхтоўкі настаўнікаў, і для перамен у школе.

Прафесія настаўніка ў Фінляндыі вельмі паважаная, таму ў ВНУ ідзе толькі добра падрыхтаваная моладзь. Раней дзейнічала правіла — дзяўчат і хлопцаў набіралі «пяцьдзясят на пяцьдзясят», але цяпер такі падыход лічыцца супрацьзаконным, таму адбіраюць выключна па ведах. А паколькі дзяўчаты дэманструюць лепшую падрыхтоўку, іх прадстаўніцтва ў прафесіі павялічваецца. Навучанне ў магістратуры — абавязковае для ўсіх будучых настаўнікаў, якія рыхтуюць быць яшчэ і даследчыкамі. Будучых педагогаў вучаць аналізу сваёй работы і глыбокаму разуменню ўсіх працэсаў, якія адбываюцца ў дзіцячым калектыве.

Пачатковая школа ў Фінляндыі — шасцігадовая. А базавую адукацыю вучні атрымліваюць на працягу дзевяці гадоў. Далей яны выбіраюць: або ідуць у старшую школу з прыцэлам на вышэйшую адукацыю, або выбіраюць прафесійна-тэхнічную падрыхтоўку.

— У старшых класах школы можна адначасова атрымліваць яшчэ і прафесію. Жаданне вучыцца не залежыць ад дабрабыту сям'і. Адукацыя для ўсіх бясплатная. Фінскі ўрад укладвае сродкі ў дзяржаўную сістэму адукацыі, каб падтрымліваць яе ў адпаведнасці з самымі высокімі стандартамі. Гэта сістэма забяспечвае роўнасць для ўсіх і ва ўсіх школах: бясплатныя падручнікі, абеды для вучняў... У нас не ўзнікае сітуацый, калі адна школа больш папулярная, таму што там створаны нейкія асаблівыя ўмовы для навучання, якіх няма ў іншых школах.

## ТЭАТР АДМЯНЯЕЦЦА!

У Фінляндыі ўсё будуецца на даверы. Прычым гэта датычыцца ўсяго грамадства. Урад давярае мясцовым муніцыпалітэтам, мясцовыя органы ўлады давяраюць дырэктару школы, дырэктар школы — настаўнікам, а бацькі давяраюць школе. Адно з асноўных дасягненняў школьнай рэформы — адсутнасць школьных інспектараў. У прафесію ідуць найлепшыя, якіх не трэба кантраляваць, яны самі ўсё зробяць для сваёй прафесійнай самарэалізацыі.

— Мы паклалі канец школьным праверкам, бо ўсе настаўнікі ведаюць, што інспекцыя — гэта тэатр: ты апранаеш касцюм, гальштук, усе сустракаюць інспектара, усміхаюцца яму, дзеці напужаныя, баяцца што-небудзь зрабіць ці сказаць не так, а калі праверка сыходзіць, мы ўсе выдыхаем: «Ну дзякуй богу, зараз вернемся да нармальнага жыцця», — кажа Кары.

У фінскай школе шмат гадоў дзейнічае сістэма самаацэнкі. Яна мае трохгадовы цыкл. Пасля заканчэння кожнага цыкла бацькам, супрацоўнікам школы і навучэнцам накіроўваецца анкета, па выніках якой вызначаюцца дзесяць кірункаў, па якіх школа паказала сябе добра, і дзесяць кірункаў, дзе яна адстае. З іх выбіраюцца тры тэмы, на якіх давядзецца сканцэнтраваць свае намаганні ў найбліжэйшы час.

— Рэгулярныя праверкі і маніторынгі ў нас не праводзяцца, хоць у некаторых краінах лічаць, што дзяцей трэба пастаянна тэсціраваць і экзаменаваць. Маўляў, так можна выявіць, наколькі добра вучні падрыхтаваны. Мае калегі з ЗША і Вялікабрытаніі скардзіліся, што вельмі стаміліся ад шматлікіх праверак, — падкрэслівае Кары. — Першы сур'ёзны тэст нашы вучні праходзяць пасля заканчэння сярэдняй школы, перад паступленнем ва ўніверсітэт. Нацыянальны савет па адукацыі можа выбарачна ўзяць некалькі школ і праверыць іх па нейкіх дысцыплінах, каб пераканацца, што сістэма добра працуе паўсюдна. Гэта як здаць аналіз крыві — калі ты ідзеш да ўрача, у цябе ж не бяруць усю кроў, а толькі некалькі кропель. Тут дзейнічае такая ж логіка: прадметам для аналізу выбарачна становіцца невялікія групы па ўсёй краіне. Школьная рэформа паклала канец канкурэнцыі за кошт лепшых лічбаў. У нас няма неабходнасці даказваць, што твая школа лепшая за суседнюю.




У Фінляндыі няма рэформаў, якія спускаюцца зверху. Міністэрства і адміністрацыя нічога не навязваюць, усё заўсёды абмяркоўваецца з настаўнікамі. Супрацоўніцтва і дыялог з педагогамі — вельмі важны момант у фінскай школе. Прычым у настаўнікаў поўная аўтаномія. Яны могуць выбіраць тую методыку, якую лічаць эфектыўнай. Настаўнікі — эксперты, і яны самі вырашаюць, як вучыць дзяцей.

## ЗНАЙСЦІ КЛЮЧЫК ДА КОЖНАГА

Асобная тэма — сістэма падтрымкі. Яна павінна быць аказана вучню адразу, як толькі з'явіліся першыя праблемы, каб парушынка не ператварылася ў бервяно. Умяшанне на раннім этапе вельмі важнае. Калі настаўнік сам не спраўляецца, ён можа запрасіць педагога па асаблівых патрэбах. Яны разам распрацоўваюць спецыяльную праграму падтрымкі. А ў вельмі сур'ёзных сітуацыях дзіця могуць перавесці ў невялікую групу (не больш за 10 вучняў). З такімі групамі працуюць настаўнік, педагог па спецыяльных патрэбах, сацыяльны работнік, які звязаны з гарадской арганізацыяй сацыяльных работнікаў, псіхолаг, школьная медсястра... Але нават калі дзяцей пераводзяць у спецыяльныя групы, усё роўна імкнуцца, каб некаторыя прадметы яны вывучалі ў вялікіх групах, а калі ў вучобе з'явіўся прагрэс, такі вучань можа вярнуцца ў свой клас.

**У прафесію ідуць найлепшыя, якіх не трэба кантраляваць, яны самі ўсё зробяць для сваёй прафесійнай самарэалізацыі.**

— Якая рабочая абстаноўка лічылася ідэальнай у школе сто гадоў таму? — пацікавіўся Кары ў беларускіх педагогаў. — Калі ў класе — цішыня, усе сядзяць за партамі, размаўляе толькі настаўнік, вучню трэба падняць руку і дачакацца дазволу, каб штосьці сказаць. Калі ён дрэнна сябе паводзіць, яго выганяюць з класа. Сёння такія падыходы неактуальныя. Калі ёсць праблема, яе трэба вырашаць, а калі дзіця проста выгнаць з класа, яно вернецца, але разам са сваёй нявырашанай праблемай.

Лічыцца, што да кожнага выхаванца педагогі павінны знайсці падыход. Калі метад у рабоце з вучнем не працуе, значыць, гэта не той метад. Задача педагога — забяспечыць сумеснае навучанне дзяцей з рознымі патрэбамі, дапамагчы кожнаму выхаванцу знайсці аптымальны спосаб дасягнення мэты. Падтрымка дзіцяці ў школе эканоміць істотныя дзяржаўныя сродкі. Калі вучань выключаецца са школы, ён становіцца беспрацоўным і ніколі не будзе плаціць падаткі. Можа стаць наркаманам, злачынцам, трапіць у турму. Для яго сям'і — гэта катастрофа, а для грамадства — занадта высокая плата.

— Раней ад школьнікаў патрабавалася ведаць сталіцы ўсіх дзяржаў, назвы рэк, мноства дат... Настаўнік выліваў вядро інфармацыі на вучня, а потым гэта інфармацыя вылівалася з яго рота. Вучань быў пасіўным спажыўцом, — працягвае фінскі эксперт. — Сёння, калі ў кожнага з нас у кішэні смартфон, няма неабходнасці ўсё ведаць на памяць. Патрабуецца базавы ўзровень ведаў, каб разумець тую інфармацыю, якую можна знайсці ў «гугле». **Куды больш важна навучыць сваіх вучняў быць гнуткімі, успрымальнымі да ўсяго новага, інавацыйнымі, умець арганізоўваць пошук новых рашэнняў.** Практычныя навукі адыгрываюць вялікую ролю, таму мы вучым сваіх выхаванцаў крытычна мысліць і самім ствараць новую інфармацыю. Гэта зусім іншы падыход да навучання.

## АДЗНАКА ЦІ ВУСНЫ КАМЕНТАРЫЙ?

Урокі доўжацца 45 хвілін. Працягласць перапынкаў — 15 хвілін. Калі ўрокі аб'ядноўваюцца, перапынак складае 30 хвілін. Гэта той час, які вучні павінны прысвяціць актыўным гульням, пажадана на свежым паветры. Фіны ўпэўнены, што ў дзяцей нельга адбіраць дзяцінства. Яны павінны гуляць і кантактаваць з равеснікамі. Нават тое, што мы называем «марнаваннем часу», насамрэч вельмі важнае для іх. Менавіта таму ніхто не падганяе дзяцей з вучобай і не патрабуе, каб малыя, якія прыходзяць у першы клас, умелі чытаць і лічыць. Тут упэўнены, што ўсяму свой час.

Для ацэньвання ў фінскіх школах выкарыстоўваецца дзесяцібальная шкала. 8 лічыцца добрай адзнакай, 9 і 10 — выдатнай, а 4 — гэта фіяска. Але адзнака значыць не вельмі многа, куды больш важна атрымаць вербальную зваротную сувязь, вусны каментарый, асабліва ў пачатковых класах, дзе балы ўвогуле не выстаўляюцца.

**Парады Кары Лаўхівуоры бацькам:**

Ешце разам з дзецьмі. Кантактуйце з дзецьмі. Чытайце разам з імі. Хадзіце разам у тэатр ці кіно. Тлумачце незразумелае. Цалуйце і абдымайце дзяцей. І будзьце для іх дарослым, а не сябрам.

«Любая адзнака, выстаўленая настаўнікам, у многім суб'ектыўная, у ёй няма адзінай праўды. Вось чаму вучань, якога ацанілі ў балах, асабліва калі ён сумняваецца ў справядлівасці ацэньвання, павінен мець магчымасць атрымаць ад настаўніка прамую зваротную сувязь, а педагог павінен растлумачыць, на чым базіравалася яго адзнака, — падкрэслівае Кары. — Педагог ставіць мэты разам з вучнем, тлумачыць, чаго ён ад яго чакае, таму ацэнка робіцца празрыстай і зразумелай».

У фінскага эксперта пацікавіліся, як можна стымуляваць дзіця без выстаўлення адзнак? «**Школьніка трэба параўноўваць не з іншымі вучнямі ў класе, а з самім сабой.** Каб дзіця разумела, наколькі яно паспяховае сёння, як развіваецца, ці далёка прайшло наперад у параўнанні з папярэднім годам. Гэта дапамагае вучню бачыць свой прагрэс, ставіць уласныя мэты і развівацца бесперапынна», — адказаў Кары.

## АДКРЫЦЬ ВОКНЫ І ДЗВЕРЫ

Паміж настаўнікамі і педагогамі ў фінскіх школах практыкуюцца вельмі дэмакратычныя па нашых мерках стасункі. «Мае вучні маглі мне сказаць: «Прывітанне, Кары!» ці «Прывітанне, Рэксі!» («Рэксі» — гэта мянушка дырэктара школы), але я не бачу ў гэтым нічога крыўднага, — кажа фінскі педагог. — Такі зварот ніколькі не змяншае мой аўтарытэт сярод вучняў. Аўтарытэт прыходзіць праз прафесіяналізм і заваёўваецца на ўроках. Канешне, заўсёды знойдуцца некалькі чалавек, якія інтэрпрэтуюць сітуацыю па-свойму, таму трэба будзе абмяркаваць яе з усім класам. Гэта як дрэсіроўка сабак. Калі ўвесь час біць свайго гадаванца, вы яго нічому не навучыце, акрамя як баяцца гаспадара. А калі вы разам з дзецьмі будзеце вучыцца адказваць на рызыкі, знаходзіць разам рашэнні, тым больш што рашэнне часта можа быць не адно, да вас абавязкова будуць прыслухоўвацца».

«Што, на вашу думку, можна было б узяць беларускай школе з фінскай, каб пакласці пачатак пераменам у сістэме адукацыі?», — запыталіся ў Кары Лаўхівуоры беларускія педагогі.

— Любыя змяненні ў школьнай сістэме патрабуюць вельмі шмат часу, таму трэба быць цярплівымі. Я думаю, што ўсё пачынаецца з падрыхтоўкі настаўніка плюс трэба даць школе дастаткова рэсурсаў, — адказаў эксперт. — Неабходна адкрываць вокны і дзверы для міжнароднага вопыту, глядзець, які падыходзіць непасрэдна да вашай сістэмы, але нельга проста ўзяць і скапіраваць чужую школьную сістэму, таму што школа і адукацыя вельмі моцна звязаны з гісторыяй і культурай канкрэтнай краіны. Але ў любым выпадку **настаўнікам трэба даваць больш свабоды і магчымасць уплываць на тыя працэсы, што адбываюцца ўнутры школы.** Вельмі важна, каб школамі кіравалі тыя людзі, якія самі былі настаўнікамі, стаялі перад класам і заваёўвалі ўвагу вучняў штодня. І каб быў пастаянны дыялог паміж адміністрацыяй і педагогамі. Школа — гэта перш за ўсё настаўнік!

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Спадчына ў законе

# ЛЯСНОЕ БОРТНІЦТВА ПАЛЕССЯ

## Сярод сусветных каштоўнасцяў чалавецтва



**Беларускія і польскія эксперты рыхтуюць дасье па лясным бортніцтве для Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.**

Работа па падрыхтоўцы дасье пачата ў мінулым годзе. Па выніках перагавораў была створана экспертная група і абмеркаваны план дзеянняў. Над намінацыйным файлам працуе ў тым ліку беларуская прыватная ўстанова па развіцці традыцыйнага бортніцтва. Работа ідзе актыўна, у сярэдзіне студзеня запланавана чарговае пасяджэнне беларускіх і польскіх экспертаў. Акрамя таго, ствараецца адмысловы фільм.

Падрыхтаваць дасье плануецца да 31 сакавіка 2018 года. Рашэнне пра ўключэнне «Ляснога бортніцтва Беларусі і Польшчы» ў Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА будзе прынята ў 2019 годзе.

У Беларусі «Лясное бортніцтва Палесся» мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Гэта старажытны промысел, заснаваны на развядзенні і трыманні лясных пчол у штучных дуплах — борцях, якія вырабляюцца і размяшчаюцца высока на дрэвах у лесе. Лясное бортніцтва ўяўляе сабой шырокі пласт навыкаў і практык, якія датычацца не толькі гэтага промыслу, але і вырабу неабходных прыстасаванняў для працы.

Промысел быў распаўсюджаны яшчэ ў V—VI стагоддзях. З часам класічнае бортніцтва стала прыходзіць у заняпад у выніку негатыўнага антрапагеннага ўздзеяння на прыроду і развіцця калоднага бортніцтва. У Польшчы гэта традыцыя перарвалася і сёння аднаўляецца. Затое ў Беларусі лясное бортніцтва захавалася ў асобных раёнах да цяперашняга часу.

Намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталля Хвір расказала, што ў лістападзе гэтага года будзе прынята рашэнне па «Будслаўскім фэсце», які знаходзіцца на разглядзе ў Сакратарыяце ЮНЕСКА.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

Валянцінкай

# МІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ

## Волас сівее — галава шалее

**Гэта не толькі пра мужчын, пра жанчын таксама. Ва ўсякім разе Марына ў свае сорак — з невялічкім хвастом — закахалася, бы ў 16: звольнілася з працы, кінула дом, сям'ю, «забіла», як той казаў, нават на дзяцей. Сказала: «Хопіць з мяне!... Жывіце як знаеце — не маленькія...» А далей — у багажнік сваёй старэнькай машыны пакідала рэчы і з'ехала, каб пачаць зусім новае і гэтым разам — сапраўднае жыццё: з каханым чалавекам, з пачынаючым, можна сказаць, фермерам, на хутары.**

Амаль паўгода яна лётала там як на крылах: ну яшчэ б — гектары зямлі, восем кароў, статак авечак, а ўжо птушку дык ніхто і не лічыў...

Уся гэта вялікая гаспадарка чакала руплівай гаспадыні, і яна з'явілася — шчыравала, што тая пчолка, — з ранку да позняга вечара, стомы — не чула, ні аб кім і ні аб чым не думала і думаць не хацела. Яна — жыла!

Толькі потым сама ў сябе і неяк міжволі стала нясмела пытацца, а хто яна тут? Гаспадыня? Як быццам, не. Жонка гаспадара? Не, гэта адназначна, бо адносіны ніяк не аформлены: Косця кажа, што людзей звязвае не штамп, не запісы ў пашпартах... Тады, можа, каханка — ад слова «кахаць»? Марыне хацелася б...

Але ж ёй за гэтыя паўгода аніводнай абновачкі, ніводнага падарунка.

Выходзіць, што яна — свайго роду наймічка?

І гэта не, бо грошы, як Косця кажа, ідуць на «развіццё бізнесу». Марыне ва ўсякім разе ніхто і нічога не дае, нават не паказвае што, зрэшты, яшчэ не найгоршае: на хутар, хоць і не хутка, дапаўзаць сталі чуткі, што яна, Марына, вось тут не першая і нават не другая, што ў Косці хапала іншых, што ён нібыта падбіраў вось такіх, не вельмі маладых, яшчэ дужых і працавітых дурніц, якія б на яго батрачылі ды ўзамен нічога не прасілі. А як толькі пачыналі, — казаў, што нікога трымаць не будзе...

Верыць у гэта Марына не хацела, у Косці ні пра што не пытала, збягаць ад яго не збіралася, бо мела (ва ўсякім разе пакуль) надзею, што ўсё ўсталюецца, прычым як найлепей...

У той дзень яна проста «адпрасілася» ў горад, дамоў — нібыта рэчаў яшчэ ўзяць, у цырульню схадзіць, пастрыгчыся... А калі папраўдзе, то на новай машыне (яны яе з Косцем купілі) праехацца па даўно знаёмых, любімых вуліцах горада, пабачыць сваіх — найперш дзяцей, унучак, былога мужа...

А ўбачыла і жахнулася.

Ну, па-першае, у яе — юрыдычна — кватэры ва ўсю гаспадарыла сяброўка сына, без пяці хвілін жонка (на шостым месяцы цяжарнасці).

Па-другое, муж, які, здаецца, зусім нядаўна стаяў перад ёй на каленях — прасіў, каб яна не сыходзіла — шчаслівы... прыжаніўся, пайшоў у прымы да знаёмай удавы.

Па-трэцяе, малыя ўнучкі (двайняткі дачкі) бабулю сваю не пазналі і вельмі спужаліся, а сама дачка...

Нееяк, яшчэ на пачатку таго новага сапраўднага жыцця, яна званіла маці, казала, што ёй вельмі цяжка, бо столькі ўсяго звалілася: дзеці, праца, недагледжаны бацька, а галоўнае — хворы муж...

«Гэта яна, каб вярнуць мяне, — разгадала «манеўры» маці. — Бач, нават мужа свайго прыпляла... Захварэў... Ды не смяшыце! Яго ж хоць у плуг запрагай: малады, цягавіты»...

— І што яму за халера? — спытала тады, бо не любіла зяця.

Дачка не адказала.

А ў мужа, як высветлілася, выявілі пухліну. І гэта шчасце яшчэ, што выявілі на самым пачатку, што аперацыя прайшла паспяхова! Але ж колькі страху было (ды і засталося!), колькі гора ў сям'і...

Таму дзверы ёй дачка яшчэ адчыніла, унучак паказала, сціплыя вясковыя гасцінцы (зарэзаць хоць нешта з жыўнасці Косця не згадзіўся) без ахвоты, але ж прыняла, чаю прапанавала...

Марына сама ад яго адмовілася — у горла не палез бы...

І ў цырульню не пайшла: уражаная ўсім, што пачула і ўбачыла, яна села ў «сваю» новую прыгожую машыну і паехала...

Куды? — пытала ў сябе. — Чаго? І дарогу перад сабой амаль што не бачыла...

Не дзіва, што ў чарговай лужыне села — на «пуза», як апошні «чайнік».

Газаваць, выбірацца з гэтай калюжыны нават не спрабавала, бо добра ведала, што зямля тут, непаводдаль ад хутара, мяккая — «засмокча» яшчэ больш. Значыць, трэба званіць, клікаць на дапамогу...

Ну вядома ж, сына! — узрадавалася Марына. — Ён добры, ён усё зразумее, ён даруе і тут жа прыедзе, ён яе выцягне! І тады...

Яны разам вернуцца дамоў! Ае, Марыну (вунь як не хацелі звальняць!), возьмуць назад на працу. Яна будзе зарабляць — хай невялікія, але ж свае грошы, гадаваць унукаў, жыць сярод сваіх...

Доўга корпалася ў сумачцы — шукала мабільнік. А калі знайшла, пачула, што ззаду — і ўсё бліжэй і бліжэй — лапоча знаёмы трактар.

— Чаго цябе пагнала ў гэтую лужыну? — з «берага» пытаўся Косця. — Аб'ехаць не магла? Дарогі мала? Праўду кажуць, курыца не птушка, а баба не кіроўца! Так што — до, даездзілася: больш машыны не ўбачыш! Першы і апошні раз пакаталася...

Марына моўчкі слухала яго папрокі, вінавата ўсміхалася, потым тупа глядзела, як спрытна ён чапляе трос, як акуратна выцягвае машыну, як прапускае яе наперад і далей «вядзе пад канвоем» — адразаючы дарогу назад.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# Каляда, Дуб і іншыя...











*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

*«...Каляда, Калядзіца!*
*Мы цябе адгулялі,*
*Добра шанавалі!*
*Цяпер цягнем да дуба —*
*Сядзі там люба!»*

Толькі на ўсходзе Міншчыны можна пачуць гэтыя словы, якія ўплятаюцца ў развітальную песню провадаў Каляд. Менавіта ў Бярэзінскім раёне захавалася своеасаблівая форма святкавання заканчэння зімовага свята, якая называецца «Цягнуць Каляду на дуба» — са сваімі песнямі, абраднымі дзействамі, вясёлымі ігрышчамі.

У многіх вёсках раёна памятаюць традыцыю і час ад часу збіраюцца на Провады. Але такіх вёсак застаецца, на жаль, усё менш і менш. І толькі ў Новінах традыцыя «Цягнуць Каляду на дуба» з кожным годам набірае абароты. Можна сказаць, калядныя провады сталі для вёскі галоўным брэндам, абрад з'яўляецца візітоўкай культуры рэгіёна, ён уключаны ў спіс помнікаў нематэрыяльнай спадчыны Беларусі.

— «Ой, Калядачкі! Вы на дуб, на дуб, а нам, дзевачкам, ніхто ня любі..», — спяваюць дзяўчаты па дарозе ў поле, ідучы за санкамі, у якіх сядзіць «бабка» са снопам-Калядою і гаршэчкам куцці. Гэтым разам на ролю паважанай «бабкі» — захавальніцы добрай сям'і і самога роду — абралі Ніну Клімовіч. Амаль два кіламетры Ніну Дзмітрыеўну хлопцы везлі за вёску Марціянаўку да стагадовага дуба.

Усцягнуўшы Каляду на дуб, павадзіўшы карагоды і падсмажыўшы на агні сала, удзельнікі вярнуліся ў вёску працягваць вясёлыя ігрышчы і скокі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by*

# ІНАВАЦЫЙНЫ ПРАРЫЎ

## З чым беларускія вучоныя прыйшлі да Дня навукі?

**Новы тэхнапарк «АкадэмТэхнаград» плануецца стварыць у Нацыянальнай акадэміі навук. Пра гэта на прэс-канферэнцыі з нагоды святкавання Дня беларускай навукі расказаў старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.**

«Калі «БелБіяград» аб'ядноўвае такія кірункі, як біятэхналогіі, медыцынскія тэхналогіі і нанатэхналогіі, то «АкадэмТэхнаград» аб'яднае ўсе кірункі тэхнічнага і інжынернага профілю і будзе займацца ўкараненнем у вытворчасць найноўшых распрацовак па інжынерных навуках», — растлумачыў ён.

Акрамя таго, Акадэмія навук плануе сфарміраваць топ-100 найлепшых распрацовак Года навукі для розных галін эканомікі.

— У нас склалася традыцыя пры падвядзенні вынікаў года вызначаць топ-10 найбольш значных навуковых дасягненняў. На днях мы ўжо апублікавалі топ-10 распрацовак за 2017 год, а цяпер фарміруем топ-100 па выніках мінулага года для розных галін эканомікі, — паведаміў Уладзімір Гусакоў. — У топ-10 увайшлі распрацоўка малагабарытнага мабільнага суперкамп'ютара для апрацоўкі вялікіх масіваў даных, устанаўленне малекулярнага механізма падаўлення імунітэту чалавека мікабактэрыямі туберкулёзу з мэтай стварэння процітуберкулёзных прэпаратаў новага пакалення, выяўленне новага ўніверсальнага індыкатара антыаксідантнага патэнцыялу для дыягностыкі ўстойлівасці чалавека да акісляльнага стрэсу, метадалогія канвертавання электроннага арфаграфічнага запісу беларускіх слоў у фанетычнай транскрыпцыі і стварэнне першага поўнага беларускага лінгвістычнага даведніка, адкрыццё на Палессі ўнікальных для сусветнай гістарычнай навукі славянскіх паселішчаў і г. д.

Напрыканцы мінулага года быў падпісаны Указ Прэзідэнта «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных навуковых арганізацый». На думку кіраўніка Акадэміі навук, гэты доўгачаканы дакумент абавязкова паспрыяе абуджэнню навуковай ініцыятывы.

— Калі інстытут зарабляе сродкі, у тым ліку за кошт продажу сваёй прадукцыі, ён зможа заахвочваць найлепшых работнікаў, якія паказалі найбольш высокія вынікі. Заробкі такіх спецыялістаў могуць узрасці ў два-тры разы, — падкрэсліў ён. — Указ пашырае правы кіраўнікоў бюджэтных навуковых арганізацый у рэгуляванні ўзроўню аплаты працы работнікаў у залежнасці ад задач, якія яны вырашаюць. У прыватнасці, было знятае абмежаванне ў памеры 40 % фонду зарплаты і эканоміі сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, пры накіраванні іх на прэміраванне і ўстанаўленне стымулявальных выплат работнікам за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў. Мы павінны разнявольваць навуковую працу і даваць вучоным магчымасць зарабляць.

**Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН** паведаміў, што ў 2017 годзе значна актывізавалася рэалізацыя праектаў Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Беларусі. У выніку па дзяржпраграме толькі за мінулы год было створана каля 2 тысяч высокапрадукцыйных працоўных месцаў і 20 інавацыйных вытворчасцяў. Напрыклад, сфарміраваны інавацыйна-прамысловы кластар высокіх тэхналогій у галіне складанай медыцынскай тэхнікі, сістэм забеспячэння бяспекі, аналітычнага прыборабудавання. Акрамя таго, наладжана вытворчасць кампазіцыйных матэрыялаў на базе айчынных тэрмапластаў для экструзійнага 3D-друку, а таксама вытворчасць цвёрдых лекавых формаў і лекавых сродкаў, якія змяшчаюць бэта-лактамныя антыбіётыкі, на прадпрыемстве «Фармтэхналогія». Да самых значных падзей варта аднесці вытворчасць па зборцы легкавых аўтамабіляў на прадпрыемства «БелДжы». «Забягаючы наперад, магу сказаць, што мы ўжо прапрацоўваем пытанні вытворчасці электратранспарту, электрамабіляў, у тым ліку на «БелДжы». Гэтыя распрацоўкі вядуцца як у Нацыянальнай акадэміі навук, так і непасрэдна з кітайскімі кампаніямі», — расказаў Аляксандр Шумілін.

Сярод значных праектаў 2017 года старшыня ДКНТ згадаў біятэхналагічны комплекс па мікраклanальным размнажэнні раслін у Цэнтральным батанічным садзе НАН Беларусі, новы дражджавы завод у Слуцку. На праектныя магутнасці выйшлі летась дзесяць інавацыйных вытворчасцяў.

**Толькі за мінулы год было створана каля 2 тысяч высокапрадукцыйных працоўных месцаў і 20 інавацыйных вытворчасцяў.**

— Як прамысловасць не можа існаваць без навукі, так і навука не можа развівацца без прамысловасці, — упэўнены **намеснік міністра прамысловасці Сяргей ГУНЬКО.** — На прадпрыемствах машынабудавання, сельгасмашынабудавання, станкабудавання, оптыка- механічнай і электратэхнічнай прамысловасці, металургіі і аўтакампанентаў працуе шмат спецыялістаў з вучонымі ступенямі — 60 кандыдатаў і 19 дактароў навук, тры члены-карэспандэнты і адзін акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук. Лінейка прадукцыі, што тут выпрабляецца, уключае дзясяткі тысяч найменняў: ад мікрасхем і клапанаў сэрца да самых вялікіх у свеце аўтамабіляў — кар'ерных самазвалаў «БелАЗ» грузападымальнасцю 450 тон.

На працягу дзесяці гадоў Міністэрствам прамысловасці фарміруецца «Міжгаліновы задачнік», які ўтрымлівае актуальныя пытанні тэхнічнага і тэхналагічнага характару. Сёння сфарміраваны шэраг актуальных задач, якія патрабуюць дапамогі з боку навукі.

Сяргей Гунько паведаміў, што летась удзельная вага інавацыйнай прадукцыі склала ў агульным аб'ёме адгружанай прадукцыі больш за 31 працэнт, а, напрыклад, на «БелАЗе» інавацыйная прадукцыя складае больш як 50 працэнтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Прызнанне

# ХТО ЁН, ВУЧОНЫ ГОДА?

**Званне «Вучоны года НАН Беларусі — 2017» прысвоена генеральнаму дырэктару Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі», дырэктару Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі Эміліі КАЛАМІЕЦ. Такое рашэнне прынята Бюро Прэзідыума НАН Беларусі.**



Эмілія Каламіец — вядомы вучоны ў галіне мікрабіялогіі і біятэхналогій, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Менавіта яна сфарміравала і актыўна развівае айчынную навуковую школу па вывучэнні біягенезу біялагічна актыўных злучэнняў з антымікробным дзеяннем і стварэнні біялагічных сродкаў абароны раслін і жывёл. Важнымі вынікамі яе навуковай дзейнасці сталі стварэнне калекцыі прамыслова каштоўных мікраарганізмаў, перспектыўных для распрацоўкі біяпестыцыдаў, прабіётыкаў, кармавых дабавак і распрацоўка арыгінальных тэхналогій стварэння біяпрэпаратаў.

Па ініцыятыве Эміліі Каламіец на базе Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі створаны цэнтр аналітычных і генна-інжынерных даследаванняў, доследна-прамысловая вытворчасць мікробных прэпаратаў, лабараторна-эксперыментальны ўчастак па вылучэнні і ачыстцы лактаферыну, тэхналагічная лінія па вытворчасці ферментаў для біясінтэзу лекавых субстанцый, завяршаецца будаўніцтва навукова-вытворчага цэнтра біятэхналогій па выпуску сухіх формаў біяпрэпаратаў з высокім экспартным патэнцыялам.

Пры непасрэдным удзеле вучонага былі распрацаваны Канцэпцыя развіцця фармацэўтычнай і біятэхналагічнай прамысловасці Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады і на перыяд да 2020 года, а таксама План развіцця біятэхналагічнай галіны на 2012—2015 гады і на перыяд да 2020 года.

Эмілія Каламіец — аўтар больш як 460 навуковых прац і 22 патэнтаў на вынаходніцтвы. Усе навукова-тэхнічныя распрацоўкі, выкананыя пад яе кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле, укаранёныя ў вытворчасць і запатрабаваныя не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і па-за яе межамі.

**З 2018 года конкурс «Вучоны года Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» будзе праводзіцца штогод. Яго мэта — заахвочванне найбольш эфектыўна працуючых вучоных, азнаменне грамадскасці з дасягненнямі навукі і ўмацаванне іміджу Нацыянальнай акадэміі навук. Званне «Вучоны года» будзе прысуджацца штогод напярэдадні святкавання Дня беларускай навукі.**

Надзея НІКАЛАЕВА

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЗАМЕНА КУХОННАЙ СОЛІ

**Фітасоль, распрацаваная ў БДУ, прызнана «Лепшым таварам Беларусі ў 2017 годзе»**

**Конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» арганізуецца па ініцыятыве Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама мінскага і абласных выканаўчых камітэтаў. Праводзіцца ён з 2002 года. Пры падвядзенні вынікаў рэспубліканская конкурсная камісія ўлічвае водгукі спажыўцоў, якія паступілі ў дачыненні да арганізацый-фіналістаў, іх прадукцыі і паслуг.**

Фітасоль дыетычнай серыі «Універсум» з паніжаным утрыманнем хлорыстага натрыю, якую распрацавалі на ўнітарным прадпрыемстве «Унітэхпрам БДУ», перамагла ў намінацыі «Харчовыя тавары». Таксама распрацоўцы вучоных БДУ быў прысуджаны статус «Навінка года».

Харчовыя дыетычныя прафілактычныя фітасолі з паніжаным утрыманнем хлорыстага натрыю серыі «Універсум» прызначаныя для замены кухоннай солі ў рацыёне чалавека. Яны выпускаюцца ў чатырох варыянтах: «Універсум Тонус», «Універсум Арома», «Універсум Энерга» і «Універсум Плюс». Уяўляюць сабой сыпкія сумесі харчовай солі, хлорыстага калію, спецый, гародніны, вострадухмяных траў, якія павышаюць парог смакавай адчувальнасці, амінакіслот і вітамінападобных рэчываў.

Сумесі забяспечваюць зніжэнне долі кухоннай солі ў ежы да 30 %, а пры змяншэнні спажывання солі зніжаецца рызыка развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі і іншых хвароб сістэмы кровазвароту. Збалансаваны прадукт прайшоў клінічныя выпрабаванні ў РНПЦ «Кардыялогія», дзе была даказана эфектыўнасць зніжэння салявой залежнасці чалавека.

Надзея НІКАЛАЕВА.

## КІЛАМЕТРЫ «ЗЯЛЁНЫХ АРТЭРЫЙ»

**Больш за тысячу кіламетраў дарог пабудавалі ў Мінлясгасе за апошнія дзесяць гадоў.**

Будаўніцтва лесагаспадарчых дарог застаецца адной з галоўных задач у міністэрстве. Толькі летась у лясным фондзе былі пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю 16 новых аб'ектаў працягласцю больш за сто кіламетраў.

Усяго ж з 2007 года ў лясным фондзе Мінлясгаса было ўведзена ў эксплуатацыю 1021,856 кіламетра лясных дарог, паведамілі ў прэс-службе ведамства. Будаўніцтва новых аб'ектаў дазваляе найперш павялічыць асваенне цяжкадаступнай разліковай лесасекі. Апроч таго, з іх дапамогай забяспечваецца своечасовае правядзенне лесаахўленчых работ і мерапрыемстваў па барацьбе з хваробамі і шкоднікамі лесу, ліквідацыі лясных пажараў.

Работа па пашырэнні дарожнай сеткі ў сістэме Мінлясгаса будзе працягнута. Сёлета запланаваны ўвод 101,613 кіламетра, а ўсяго да канца пяцігодкі, згодна з зацверджанай праграмай «Беларускі лес», пачнуць эксплуатавацца 500 кіламетраў новых дарог.

У рамках выканання папярэдняй праграмы будаўніцтва лесагаспадарчых дарог на 2011—2015 гады ў сістэме Міністэрства лясной гаспадаркі пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю 570,1 кіламетра дарог. Гэта адбілася на аб'ёмах нарыхтоўкі драўніны: калі ў 2010 годзе ў краіне было нарыхтавана 15,5 мільёна кубаметраў, дык летась — ужо 22,5 мільёна кубаметраў.

## БЕЛАРУСАК НАВУЧАЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА ХАРВЕСТАРАХ І ФАРВАРДАРАХ

**Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі. Набор эксперыментальнай жаночай групы па падрыхтоўцы машыністаў шматаперацыйных лесанарыхтоўчых машын (харвестараў і фарвардараў) праводзіць цяпер Рэспубліканскі цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў лясной гаспадаркі.**

Для таго каб папоўніць шэрагі навучэнцаў, дзяўчатам неабходна мець пасведчанне трактарыста-машыніста з адзнакай аб дазволе кіраваць трактарамі і машынамі катэгорыі «В», а таксама медыцынскую даведку адпаведнага ўзору.



Навучанне пачнецца па меры камплектавання групы (мінімум 12 чалавек) і будзе праходзіць на працягу некалькіх тыдняў. У праграме курсаў прадугледжана вывучэнне: устройства і правілаў эксплуатацыі шматаперацыйных лесанарыхтоўчых машын; тэхналогій, прыёмаў і метадаў працы па нарыхтоўцы і вывазцы драўніны; патрабаванняў тэхнікі бяспекі пры іх эксплуатацыі; культуры вытворчасці і інш.

Спецыялісты спадзяюцца на паспяховую рэалізацыю адукацыйна-вытворчага праекта, паколькі жанчыны адрозніваюцца адказным стаўленнем да сваёй прафесіі і валодаюць такімі якасцямі, як уважлівасць, акуратнасць і беражлівасць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

# ПАРК, ЯК У СІНГАПУРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Пажылыя жыхары Партызанскага раёна сталіцы вучацца скандынаўскай хадзе.**
*(Фота прадастаўлена ТЦСАН Партызанскага раёна Мінска.)*

Тэрапеўтычны парк плануецца стварыць у зялёнай зоне паміж завулкам Клумава і водным каналам, што ў Партызанскім раёне Мінска. Тут жыве асабліва шмат пажылых людзей — наогул, па статыстыцы, кожны чацвёрты жыхар Партызанскага раёна атрымлівае пенсіі і дапамогі. Арганізатары праекта сустрэліся з пенсіянерамі, якія пражываюць паблізу, выслухалі іх прапановы і пажаданні, абмеркавалі разам з імі, дзе менавіта будзе лепш закласці Тэрапеўтычны парк. Вядома, гэта павінна быць месца, дзе яны часцей за ўсё ходзяць. Сумесна вырашылі, што парк будзе пачынацца насупраць Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Пенсіянеры часта тут бываюць, адначасова любяць прагуляцца па зялёнай зоне, што побач, але там практычна няма лавачак, каб прысесці адпачыць...

Акрамя ўстаноўкі лавак, у Тэрапеўтычным парку будуць створаны некалькі ландшафтных аб'ектаў, пераносныя клумбы, вясной будуць высаджаны расліны і ўсталяваны інфармацыйны стэнд. Пасля размовы з пенсіянерамі аказалася, што



**Тэрапеўтычны сад у парку Бішан-Анг Мо Кіа, Сінгапур. Адкрыты 19 верасня 2017 года.**

яны сустракаюць з цікавасцю, падтрымліваюць і інтэлектуальныя гульні, і аздараўленчыя праграмы.

Тэрапеўтычны эфект у зоне адпачынку будзе дасягацца за кошт прадуманасці дэталяў. Лаўкі будуць павернутыя ў розныя бакі, каб можна было выбраць найбольш прыдатны пейзаж. Запланавана набыць і пасадзіць расліны, якія прыцягваюць птушак і матылькоў, каб у наведвальнікаў была магчымасць назіраць за імі ў натуральным асяроддзі. Акрамя гэтага, расліны будуць падабраныя па каляровай гаме і тэкстуры — гэты аспект лічыцца асабліва важным, бо адчуванне дотыку, як правіла, захоўваецца і ў пажылым узросце, калі іншыя пачуцці ўжо не такія вострыя.

— Я прачытала, што ў Сінгапуры год таму адкрыўся Тэрапеўтычны сад для пажылых людзей, і падумала, што гэтую ідэю не так ужо складана паўтарыць і ў нас, — кажа **Паўліна ІВАНЬКО, аўтар ідэі і куратар гэтага праекта, спецыяліст па камунікацыі Швейцарскага Чырвонага Крыжа.**

Ініцыятыву падтрымалі мясцовыя органы ўлады: праект быў узгоднены з адміністрацыяй Партызанскага раёна яшчэ ўвосень. Далучыўся да яе і Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Партызанскага раёна сталіцы. Добраўпарадкоўваць тэрыторыю і падтрымліваць работу парку гатовыя валанцёры Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа, сярод якіх ёсць і пажылыя людзі. Увогуле, каманда ўжо сфарміравана.

— Мы падалі заяўку на конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend, — кажа Паўліна Іванько, — і ў снежні выйшлі ў фінал. У выніку атрымалі прыз глядацкіх сімпатый і дыплом, а таксама фінансавую падтрымку ад мецэната Юрыя Мельнічка. Неўзабаве пачнём рабіць закупкі неабходнага абсталявання. Але, вядома ж, уся асноўная работа ў нас наперадзе. Увесну пяройдзем да азелянення. Адкрыць Тэрапеўтычны парк для наведвальнікаў плануем сёлета ў маі.

Арганізатары ініцыятывы ўпэўненыя, што гэты парк будзе карысны не толькі пажылым людзям, колькасць якіх у нашай краіне, дарэчы, з кожным годам павялічваецца, але і ўсім астатнім. Яны лічаць: тое, што добра для пажылых, добра і для ўсіх. Безбар'ернае асяроддзе будзе зручнае і для мам з каляскамі, і для людзей з інваліднасцю, і ў цэлым падыдзе людзям рознага ўзросту і здароўя. Бо ўсе мы, гараджане, маем патрэбу ў такім зялёным месцы, дзе можна зменшыць тэмп, спыніцца, зрабіць паўзу ў жыццёвай гонцы.

**Адкрыць Тэрапеўтычны парк для наведвальнікаў плануецца сёлета ў маі.**

— Мы верым, што наш праект дазволіць зрабіць крок да стварэння грамадства, дружалюбнага да пажылых людзей, і горада, зручнага для людзей любога ўзросту, — гаворыць Паўліна Іванько. — Яшчэ ў 2007 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя (далей — СААЗ) выпусціла Глабальнае кіраўніцтва па стварэнні ў гарадах спрыяльных умоў для пажылых людзей. Сярод яго рэкамендацый ёсць канкрэтныя практычныя крокі (напрыклад, размяшчэнне ў зялёных зонах горада дастатковай колькасці зручных лавак), а таксама доўгатэрміновыя задачы (фарміраванне грамадзянскай культуры, якая паважае пажылых людзей і ўлічвае іх інтарэсы). СААЗ адзначыла ўжо 258 гарадоў з 28 краін як гарады са спрыяльнымі ўмовамі для пажылых людзей. Мы хочам, каб да іх ліку далучыўся і Мінск.

Дарэчы, і зімой парк таксама будзе выкарыстоўвацца: актывісты з ліку пажылых людзей вырашылі, што разам будуць арганізоўваць вольны час, у прыватнасці, доўгія пешыя прагулкі па парку. Ужо праведзены майстар-клас па скандынаўскай хадзе для пенсіянераў, якія пражываюць паблізу...

**Святлана БУСЬКО**

■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ДЖОЎЛІ СУПРАЦЬ ЗВЕРА,

## ці Як «шакіраваць» ляснога жыхара ў мэтах самаабароны?

**На «гарачую лінію» нашай газеты звярнуўся чытач з пытаннем, якое датычылася магчымасці набыцця або электрашокера, або пнеўматычнай зброі. Падставы для такога кроку ў заяўніка былі наступныя.**

**— Мы жывём пад Ракавам, фактычна ў лесе. Неяк, прагульваючыся, бачылі лісу. Летам неаднойчы натыкаліся на сляды дзіка. У нас маленькая дачушка, да таго ж жонка любіць збіраць грыбы. А як сустрэнецца з якім лясным зверам? Вось я і падумаў, што няблага б было ў якасці сродку самаабароны набыць або электрашокер, або пнеўматычную зброю, напрыклад, пісталет. Але зрабіць гэта хацелася б на цалкам законных падставах, каб не было ніякіх праблем. Падкажыце, як гэта можна зрабіць, куды звяртацца па дазвол? — пытаўся наш чытач.**

Каб адказаць на гэтыя пытанні, мы мусілі звярнуцца ў аддзел ліцэнзійна-дазвольнай работы ўпраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў. Вось які адказ атрымала неўзабаве рэдакцыя.

Артыкул 7 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зброі» рэгламентуе тыя віды зброі, якія грамадзяне могуць мець і прымяняць для самаабароны. Гэта газавая зброя — газавыя пісталеты, газавыя рэвальверы і патроны да іх, механічныя распыляльнікі, аэразольныя і іншыя прылады (так званыя газавыя балончыкі) з рэчывамі слёзатачывага або раздражняльнага дзеяння, дазволенымі да выкарыстання Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Гаворка таксама ідзе пра электрашокавыя прылады і іскравыя разраднікі, выхадныя параметры якіх адпавядаюць нормам, што таксама ўстанаўліваюцца Міністэрствам аховы здароўя.

Газавыя пісталеты і рэвальверы маюць права набываць грамадзяне, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту і якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, на падставе дазволу з наступнай рэгістрацыяй іх у 10-дзённы тэрмін у органах унутраных спраў. Для атрымання гэтага дазволу неабходна звярнуцца ў тэрытарыяльны орган па месцы жыхарства, прадставіць медыцынскую даведку аб стане здароўя (адсутнасці медыцынскіх проціпаказанняў да валодання зброяй, напрыклад, дрэннага зроку ці дэфектаў канечнасцяў, псіхічных захворванняў, алкагалізму, наркаманіі ці таксікаманіі), азнаёміцца з мерамі бяспечнага абыходжання з такой зброяй. Паралельна з гэтым праваахоўныя органы высветляць, наколькі грамадзянін законапаслухмяны (адсутнасць адміністрацыйных правапарушэнняў па шэрагу артыкулаў Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і крымінальна каральных дзеянняў).

Заява разглядаецца на працягу месяца і ў выпадку станоўчага рашэння пытання выдаецца дазвол на набыццё. Папярэдне за яго выдачу неабходна аплаціць збор (адна базавая велічыня). За рэгістрацыю зброі неабходна будзе ўнесці дзве базавыя велічыні. Дазвол на захаванне і нашэнне зброі выдаецца тэрмінам на тры гады.

Механічныя распыляльнікі, аэразольныя і іншыя прылады з рэчывамі слёзатачывага або раздражняльнага дзеяння, электрашокавыя прылады і іскравыя разраднікі, якія адпавядаюць нормам, што ўстанаўліваюцца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, рэгістрацыі не падлягаюць і набываюцца без атрымання дазволу.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб зброі», усю пнеўматыку можна падзяліць на дзве катэгорыі ў залежнасці ад дульнай энергіі, якая вымяраецца ў джоўлях. З дульнай энергіяй да трох джоўляў пнеўматычныя вырабы зброяй не з'яўляюцца і адносяцца да канструкцыйна падобных да зброі вырабаў. Іх можна свабодна купіць у крамах або на рынках. Пры гэтым абавязкова наяўнасць сертыфіката адпаведнасці.

Пнеўматыка з дульнай энергіяй звыш трох джоўляў ужо з'яўляецца пнеўматычнай зброяй, набываецца для ўдасканалення навыкаў спартыўнай стральбы. Згодна з заканадаўствам, пнеўматычная зброя з дульнай энергіяй ад трох да 7,5 джоўля рэгістрацыі не падлягае і набываецца без атрымання дазволу. Але для яе набыцця маецца шэраг абмежаванняў, у тым ліку ўзроставае — з 18 гадоў. Калі ж дульная энергія перавышае 7,5 джоўля, такую зброю можна купіць толькі па дазволах, і рэгіструецца яна ў органах унутраных спраў. Трэба, у прыватнасці, мець пацвярджальныя дакументы аб занятках спортам, медыцынскую даведку аб стане здароўя, прыйдзецца вывучыць меры бяспечнага абыходжання са зброяй і набыць металічную скрыню для яе захоўвання. Любая пнеўматычная зброя павінна мець сертыфікат адпаведнасці і прадавацца толькі ў спецыялізаваных крамах, якія маюць ліцэнзію МУС.

Каб закрыць тэму, некалькі слоў і пра траўматычную зброю. Згодна з артыкулам 1 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зброі», агнястрэльная зброя траўматычнага дзеяння — агнястрэльная кароткаствольная ці бясствольная зброя, прызначаная для паражэння жывой цэлі на адлегласці кідальным элементам траўматычнага патрона і не прызначаная для прычынення смерці чалавеку. Дык вось, у адпаведнасці з артыкулам 8 Закона, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь забаронены абарот у якасці службовай і грамадзянскай зброі агнястрэльнай зброі траўматычнага дзеяння і траўматычных патронаў. За парушэнне прадугледжана крымінальная адказнасць.

Напрыканцы мы звярнуліся да работнікаў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь з пытаннем: што б яны як прыродаахоўнікі (а многія з іх колішнія вайскоўцы і дзейныя паляўнічыя) параілі ў сітуацыі, апісанай чытачом.

— Калі ёсць такое жаданне, лепш за ўсё набыць у паляўнічай краме газавы пярцовы балончык «Шок». Ім можна будзе адпудзіць звера, ды і дазволу на куплю не трэба, — сказалі нам. — Але самае галоўнае, што трэба памятаць: нармальныя паводзіны дзікай жывёлы — баяцца чалавека. Калі звер адкрыта выходзіць на яго, значыць, ёсць праблемы...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Фота слова

*Вось вам і снег! Хіба ж не вы чакалі,*
*Гукалі, як вясну, зімовы час?*
*Ад вас завея засланіла далі,*
*Буран усе шляхі схаваў ад вас.*

*Адно, што цешыць, — вернецца ўзімку*
*І прыйдзе на ўзлескі снегапад —*
*Падорыць футры белыя ялінкам,*
*Як абяцаў ім гэта год назад.*



■ Рэгіёны

## Першы на Гомельшчыне паштамат

**Аўтаматызаваная паштовая станцыя для самастойнага атрымання пасылак пачала працаваць у тэставым рэжыме недалёка ад чыгуначнага і аўтавакзалаў — па вуліцы Курчатава, 2.**

Спачатку можна падумаць, што гэта банкамат ці інфакіёск, але вакол яго размешчаны скрынкі розных памераў. **Дырэктар Гомельскага філіяла Белпошты Галіна ЦЯРЭШЧАНКА** гаворыць, што карыстацца паштаматам проста:

— Каб з яго дапамогай атрымаць міжнароднае паштовае адпраўленне, трэба зарэгістравацца на афіцыйным сайце Белпошты і зрабіць перанакіраванне пасылкі на гомельскі паштамат. Калі пасылка паступае ў паштовы тэрмінал, прыходзіць sms-апавяшчэнне і паведамленне на электронную скрыню са спецыяльным кодам. Калі пасылку не забраць на працягу трох дзён, яна будзе накіравана ў аддзяленне паштовай сувязі па месцы абслугоўвання адрасата.

Што важна, паштамат працуе бясплатна і кругласутачна, ён не мае перапынку на абед і выхадных дзён. Лімітаваныя памеры адпраўленняў вызначаюцца з улікам памеру самай вялікай скрыні: шырыня — 400 мм, вышыня — 390 мм, глыбіня — 500 мм. Максімальная вага пасылкі — 10 кг. Пры наяўнні мытных пошлін, а таксама ў выпадку аплаты накладным плацяжом на экране адлюстроўваецца сума, якую тут жа можна аплаціць банкаўскай карткай. Дарэчы, для атрымання пасылкі не патрэбен пашпарт.

## Новаму мікрараёну — новае аддзяленне

**Жыхары Паўднёвага мікрараёна Гомеля, вядомага як 104-ы, цяпер абслугоўваюцца ў новым памяшканні аддзялення паштовай сувязі. З нязручнага кіёска яно цяпер пераехала ў будынак гандлёвага цэнтра на вуліцы Дубраўнай, 11.**

Першыя кліенты атрымалі падарункі ў дзень адкрыцця, а астатнія больш чым 12 тысяч будуць наведваць пошту па меры неабходнасці. Нацыянальны аператар паштовай сувязі краіны чарговы раз падкрэсліў галоўную сваю місію: быць бліжэй да кліентаў. Плошча новага аб'екта складае каля 40 кв. м. За ўласныя сродкі прадпрыемства зрабіла поўны комплекс рамонтных работ, і зараз аддзяленне адпавядае ўсім сучасным патрабаванням. У аперацыйнай зале арганізавана два працоўныя месцы, дзе будзе ажыццяўляцца ўвесь спектр неабходных паслуг, у тым ліку і дастаўка паштовых адпраўленняў. Створаны максімальна камфортныя ўмовы як для супрацоўнікаў аддзялення, так і для кліентаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Мой паштальён

## «Наша Машачка»

**Так калегі пяшчотна называюць паштальёна пятага разраду Марыю Перарэжку. 21-гадовая дзяўчына працуе ў аддзяленні сувязі Петрыкаў-2 Гомельскага філіяла прадпрыемства.**




У паштальёны Марыя прыйшла два з паловай гады таму. Дысцыплінаваная, старанная, акуратная... Не дзіва, што дзяўчына палюбілася і калектыву, і мясцовым жыхарам, якія наведваюць аддзяленне. У абавязках юнай работніцы — прыём падпіскі на перыядычныя выданні, продаж латарэйных квіткоў і тавараў народнага спажывання. З заданнямі Марыя спраўляецца. І нават больш. Так, план па падпісцы за мінулы год паштальён выканала на 105 працэнтаў, а тавараў паўсядзённага попыту рэалізавала на 15 працэнтаў больш за неабходны мінімум.

Начальства юную работніцу хваліць: усё ж такі падтрымлівае рэпутацыю аддзялення на высокім узроўні. А Марыя пераймае вопыт старэйшых калег і даказвае, што абслужыць на пошце хутка і з усмешкай могуць не толькі ў сталіцы

■ З нагоды

# ЯРКІ ЛЕТАПІС ДЗЯРЖАВЫ

### БЕЛАРУСКІЯ МАРКІ — У 60 КРАІНАХ СВЕТУ

**Сёлета калектыў выдавецкага цэнтра «Марка» Белпошты атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта за значны ўклад у захаванне духоўнай спадчыны краіны. Асобна былі адзначаны праекты, прысвечаныя 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. З начальнікам цэнтра Ірынай ШЫПІЛАВАЙ гутарым пра мастакоў, што працуюць над мініяцюрамі, цікавасць замежных калекцыянераў да нашай паштовай прадукцыі і планы на бягучы год.**



***— Першая беларуская паштовая марка ўбачыла свет у 1992 годзе. Як спалучаецца традыцыі і інавацыі ў сваёй справе?***

— За чвэрць века ў абарачэнне ўведзена нямала беларускіх марак. Калі казаць пра мастацкія, то іх больш за 1200. Гэта не проста канві паштовай аплаты, а мастацкія мініяцюры з рознымі складанымі паслядрукаванымі дапрацоўкамі.

Традыцыйныя падыходы, якія мы захоўваем, — гэта багатая тэматыка, якасны выраб, аптымальныя тыражы, своечасовае інфармаванне. А калі казаць пра інавацыі ў філатэліі, то галоўны дэвіз у нашай рабоце павінен гучаць так: «Не нашкодзь!» Бо і сёння марка выконвае тры функцыі: служыць для аплаты паштовых збораў, уяўляе сабой прадмет калекцыянавання, з'яўляецца выразным сродкам адлюстравання знамянальных падзей у гісторыі дзяржавы і прапаганды яе культурнай спадчыны.

***— Як даўно вы кіруеце цэнтрам? Ці збіраеце маркі самі?***

— У кастрычніку будзе 10 гадоў, як я была прызначана начальнікам выдавецкага цэнтра. За гэты час было шмат прыгожых праектаў, дынамічнай працы, цудоўных людзей! У калектыве нямногія калекцыяніруюць маркі — мы іх не збіраем, мы імі жывём.

***— Раскажыце пра работу над маркамі, якія былі адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта.***

— Праект, прысвечаны 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, распрацавала наш вядучы дызайнер Алена Мядзведзь. Мастацкай асновай марак сталі партрэты майстроў пяра, напісаныя народным мастаком СССР Міхаілам Савіцкім (з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея). Для афармлення канвертаў Першага дня і палёў марачных лістоў вывучаліся архівы Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Паштовы блок «500-годдзе беларускага кнігадрукавання» падрыхтаваны па матэрыялах з Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У аснове маркі — старонка з Псалтыра. Вобраз Францыска Скарыны ўвасобіла мастак Таццяна Дольская. А вядучы дызайнер цэнтра Марына Віткоўская сабрала ўсё ў адзіную кампазіцыю.




***— Ці вялікі калектыў «Маркі»? Як вы знаходзіце мастакоў?***

— У нас працуюць 39 чалавек. Над стварэннем арыгінал-макетаў паштовых мініяцюр шчыруюць чатыры дызайнеры, якія з трымценнем ставяцца да любімай справы. Сюжэты пільна вывяраюцца на гістарычную адпаведнасць спецыялістамі ў галіне культуры, гісторыі і архітэктуры.

Пры неабходнасці да работы прыцягваюцца таленавітыя мастакі. Асабліва хацелася б адзначыць прафесійны падыход Аляксандра Міцяніна і Таццяны Дольскай — аўтараў вельмі многіх паштовых выпускаў. Напрыклад, Аляксандр Міцянін — біёлаг па адукацыі — спецыялізуецца на тэматыцы флоры і фаўны і распрацоўвае унікальны матэрыял на працягу 15 гадоў. Яркімі і душэўнымі атрымаліся леташнія праекты «Шчаняты» і «Кацяняты» з серыі «Дзіцячая філатэлія». У студзені гэтага года ўведзена ў абарачэнне серыя марак «Птушаняты». Цяпер зацверджаны і знаходзяцца на стадыі тыражавання мастацкія мініяцюры «Выпуск па тэматыцы РСС. Запаведнікі» і «Птушка года. Чорнагаловы шчыгол».

Разам з тым мы шукаем новыя формы падачы марак, новыя імёны. Сёлета да стварэння паштовай прадукцыі далучыліся два мастакі — Віктар Чайчук і Вольга Капачова.

***— Наколькі беларускія маркі запатрабаваны ў філатэлістаў?***

— У свеце назіраецца агульная тэндэнцыя зніжэння цікавасці да калекцыянавання паштовых мініяцюр. Гэта выклікана развіццём інфарматызацыі грамадства, у першую чаргу пасродкам інтэрнэту. Але магу з упэўненасцю сказаць, што інтарэс да беларускіх марак ёсць.

У красавіку 2017-га адбылася IX Нацыянальная філатэлістычная выстава «Белфіла-2017», прысвечаная 25-годдзю першай беларускай маркі і 950-годдзю Мінска. Яна праводзілася ў рамках XXIV Міжнароднага спецыялізаванага форуму па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «ТІБО-2017». На выставе было прадстаўлена 115 калекцый з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Германіі, Казахстана, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны. Цешыў актыўны ўдзел дзяцей і моладзі: у юнацкім класе экспанавалася 21 калекцыя. Хочацца акцэнтаваць увагу на тым, што паштовая марка цікава і падрастаючаму пакаленню.

Беларускі філатэлістычны матэрыял адгружаецца на экспарт у 60 краін свету па міжнародных кантрактах і прыватным абанеменце (876 калекцыянераў). Гэта работа патрабуе асаблівай уважлівасці і акуратнасці, таму на згаданым кірунку працуюць вопытныя і кваліфікаваныя спецыялісты.

***— Якія знакавыя культурныя і гістарычныя падзеі адлюструюцца на мастацкіх мініяцюрах у бягучым годзе?***

— План выдання дзяржаўных знакаў паштовай аплаты на 2018 год прадстаўлены разнапланавымі значнымі тэмамі. У творчага калектыву цэнтра ёсць цікавыя ідэі, пацверджаныя паліграфічнымі магчымасцямі друкарняў. Спадзяёмся, што вынік нашай працы будзе яшчэ больш цікавы і калекцыянерам, і тым, хто проста вывучае гісторыю і шукае новых ведаў.

Вось некаторыя праекты, тэматыка якіх прадстаўлена ўпершыню: «400 гадоў з дня друкавання першага ў свеце «Буквара», «Адміралы ваенна-марскога флоту, ураджэнцы Беларусі», маркі серыі «Шэдэўры жывапісу з музеяў Беларусі» з рэпрадукцыямі карцін Айвазоўскага, Шышкіна, Куінджы, Саўрасава.

***— На вашу думку, чаму маркі маюць важнае значэнне ў захаванні духоўнай спадчыны краіны?***

— Як мы ведаем, сучаснасць і будучыня немагчымыя без мінулага. Наша краіна мае багатую культурную спадчыну, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Важна захаваць памяць пра мінулае. І ў гэтым дапамагаюць маркі. Адлюстроўваючы падзеі знамянальныя гістарычныя і сучасныя, паштовыя мініяцюры разлятаюцца па ўсім свеце, трапляюць у альбомы айчынных і замежных філатэлістаў, расказваюць пра нашу краіну ўласцівай ім выразнай мовай.

Выпуск кожнай маркі — гэта адначасова карпатлівая праца, даследчая работа і, вядома, творчасць. Можна з упэўненасцю сказаць, што паштовыя выпускі складваюцца ў яркі, дынамічны летапіс дзяржавы. Нездарма даўно стаў крылатым трапны выраз «Паштовая марка — гэта візітная картка краіны».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

### ДАРЭЧЫ

З 29 студзеня да 28 лютага ўсе ахвотныя могуць паўдзельнічаць у конкурсе-апытанні на найлепшую паштовую марку Беларусі 2017 года.

Для гэтага неабходна зайсці на сайт Белпошты ў раздзел «Філатэлія», спампаваць бланк анкеты, запоўніць яго, пазначыўшы нумар маркі ці блока, якія спадабаліся найбольш, і выслаць на электронны адрас vinch@belpost.by. Азнаёміцца з умовамі конкурсу і паўдзельнічаць у ім можна таксама ў любым аддзяленні сувязі краіны. У гэтым выпадку анкету з паметкай «Конкурс» трэба накіраваць на адрас: выдавецкі цэнтр «Марка» РУП «Белпошта», пр. Незалежнасці, 10, 220050, г. Мінск.

Сярод усіх удзельнікаў апытання, якія дашлюць лісты ў тэрмін і назавуць марку-пераможцу, будуць разыграны прызы — наборы філатэлістычнай прадукцыі.

■ Запрашальнік

# «Шчырасць непрыхарошанага жыцця»

## Творчасць маладых па-букоўску

**Чарльз Букоўскі — амерыканскі літаратар нямецкага паходжання, які жыў у XX стагоддзі. Яго прозу і вершы адносяць да «бруднага рэалізму» — у іх прадстаўлены далёка не лепшыя бакі жыцця людзей і абставін, што іх атачаюць. У наш час творчасць гэтага аўтара знаходзіць усё больш і больш прыхільнікаў. Адразу дзве імпрэзы ў Мінску прысвечаны такому неадназначнаму і культаваму для некаторых прыхільнікаў аўтару.**



У беларускую сталіцу з Гомеля завітала тэатральная майстэрня «Сляды». Яна прадставіла мінчукам монаспектакль «Самая прыгожая жанчына ў горадзе», зроблены па апавяданнях Чарльза Букоўскі. Да гэтага часу «Самую прыгожую» ўжо паспелі ўбачыць гледачы самых буйных гарадоў Беларусі, а таксама Масквы, Пецярбурга, Пермі і іншых. Спектакль быў паказаны амаль 200 разоў на самых розных, як тэатральных, так і на непрыстасаваных адмыслова для паказаў пляцоўках.

**Заснавальнік «Сляроў» — малады гамяльчанін Аляксандр КУРЦ.** Сёння яму 31 год і жыве ён у Санкт-Пецярбургу. У хлопца няма прафесійнай вышэйшай адукацыі, затое ёсць вялікі талент і жаданне тварыць. Пачынаў ён сваё тэатральнае жыццё ў якасці гукарэжысёра гарадскога цэнтра культуры Гомеля. Юнак паступова ішоў да стварэння свайго калектыву, затым у адзін момант кінуў усё і вырашыў цалкам прысвяціць сябе тэатру. Тры гады тулянняў, падарожжаў і роздумаў не прайшлі марна. Адным з вынікаў творчых пошукаў стаў спектакль «Самая прыгожая жанчына ў горадзе». Нядаўна яго можна было пабачыць у сталічным Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. Аляксандр Курц у гэтай пастаноўцы з'яўляецца і аўтарам, і рэжысёрам, і выканаўцам.

Сёння ў кнігарні «Логвінаў» адбудзецца прэзентацыя першай кнігі Чарльза Букоўскі па-беларуску — зборніка, які мае назву «Святло, і паветра, і месца, і час». Гэта каля паўсотні вершаў знакамітага амерыканскага аўтара на беларускай мове. Выданне можна лічыць беспрэцэдэнтным: вершаваныя пераклады аднаго з самых скандальных аўтараў XX стагоддзя нават на рускай мове былі надрукаваныя кнігай толькі ў 2007 годзе. Аўтарскія правы на творы захаваныя, а вершы пераствораны трыма перакладчыцамі: Ганнай Комар, Юліяй Цімафеевай і Наталляй Бінкевіч.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Кніжная паліца

# КАБ ЧАЛАВЕК ЗАСТАВАЎСЯ ЧАЛАВЕКАМ

## «Мастацкая літаратура» завяршыла выданне Збору твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі

**Дзясяты том, які толькі што прыйшоў з друкарні — паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа, увабраў пад сваю вокладку п'есу «Птушкі між маланак», вершы (так! Іван Навуменка пачынаў у маладосці з паэтычных спробаў), інтэрв'ю, анкеты, выступленні, водзывы на дысертацыі, некралогі, аўтабіяграфію, успаміны, дзённікавыя запісы, лісты літаратара 1944—2003 гадоў. Шкада, што па-за ўвагай засталіся публіцыстычныя выступленні пісьменніка ў друку. Дарэчы, у 1951—1952 гадах Іван Навуменка працаваў карэспандэнтам «Звязды». А раней — у мазырскай абласной газеце «Бальшавік Палесся». Назвы некаторых «звяздоўскіх» публікацый пісьменніка: «Новы хлеб», «На Нарачы», «Сельскія камуністы»... У «Звяздзе», «Чырвонай змене» ён рэцэнзаваў кнігі Анатоля Вялюгіна, Івана Мележа.**

Вось што яшчэ ў 1968 годзе Іван Якаўлевіч пісаў пра «Звязду»: «Жыццё пасля вайны было нялёгкім — разбураныя гарады, спаленыя вёскі, зямлянкі, неўраджайны, засушлівы сорак шосты год, жонкі-ўдовы, дзеці-сіроты. І ўсё ж кожны новы дзень нёс новыя падзеі і спадзяванні. Варта было цаніць тое, што ёсць — здабытае крывёю, нечалавечымі пакутамі.

Гэты настрой журналісты «Звязды», мне здаецца, добра адчувалі. Газета ў той час друкавала многа карэспандэнцый, замалёвак, нарысаў, якія як бы дыхалі радасцю заваяванага мірнага жыцця, паэтызавалі калгасныя і саўгасныя будні. Куды толькі не завітвалі звяздоўцы! Тэмай карэспандэнцыі, замалёўкі рабілася гутарка вяскоўцаў на прызбе, зімовы дзень ці вечар у калгасе, новы дом, у які сям'я перасялілася з зямлянкі, малюнак таго, як красуе на полі жыта, як цвіце лён, як абмалочваецца першы сноп.

Мне тады здавалася, што «Звязда» спявае. Вельмі многія яе матэрыялы вызначаліся шчырасцю, цеплынёй, чалавечнасцю, яны як бы мелі на мэце паказаць чытачу шырыню жыццёвых далягляду, абудзіць у ім радасць, веру ў лепшую будучыню». І яшчэ: «Пасляваенная «Звязда» хораша адчувала і паказвала звычайнага чалавека — трактарыста, каваля, хлебароба, даярку. Яны былі асноўнымі героямі яе матэрыялаў. Іх вачыма газета ўмела глядзець на свет, на жыццё». Шчырыя, цёплыя словы-перакананні народнага пісьменніка Беларусі — як напамін пра сапраўдныя каштоўнасці жыцця.

Збор твораў Івана Навуменкі — плён працы калектыву Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Рэдактар дзясятага тома — доктар філалагічных навук Сцяпан Лаўшук. Падрыхтоўка тэкстаў, каментарыі, пасляслоўе належаць Наталлі Пыско. Тыраж выдання — 1500 экзэмпляраў.

**Сяргей ШЫЧКО**

# Архімандрыт у кедах

### Галоўнае ўжо здзейснілася

Пасха — гэта тая кропля, якая трапіла ў наша быццё, а кругі ад яе разышліся і ў мінулае, і ў будучыню. Тое, што мы чытаем у Старым Запавеце пра Хрыста — гэта не прадказанні. Яны — пасля-казанні адносна Пасхі. Усё ўжо здзейснілася. Усё ўжо ёсць. І тут могуць быць розныя цікавыя думкі пра наш асабісты лёс, лёс чалавецтва... Для мяне гэта перш за ўсё той стрыжань, той асявы час, вакол якога ўсё астатняе выбудоўваецца. Пасха ў цэнтры ўсяго і яна надае сэнс усяму астатняму.

### Кожнаму свой крыж

У кнігах пра Гары Потэра быў такі персанаж — Рубеус Хагрыд. У яго была мянушка «захавальнік ключоў і традыцый». У кожным грамадстве ёсць свае захавальнікі ключоў і традыцый. У нашым Свята-Мікольскім манастыры гэта намеснік — архімандрыт Амвросій (Шаўцоў). Заўсёды павінны быць людзі, якія адказныя за асновы, за падмурак. А ёсць тыя, хто рухаецца наперад, падвяргаючы усё сумненню. Такім чынам у свеце ўсё балансуецца. Не трэба на чалавека ўскладаць задачы, якія яму не пад сілу несці. Кожны з нас нясе свой крыж і дастаткова з яго.

### Адукаванасць перашкаджае благадаці?

Большасці людзей дастаткова проста хадзіць у царкву, выконваць абрады. Святара яны ўспрымаюць як чалавека, які адпраўляе гэтыя абрады. І больш ад яго нічога не хочуць. Святар, які гаворыць аб нечым большым, выклікае спалох. Я гэта ведаю па сабе. Адзін з нашых прыхаджан неяк сказаў:

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



«Так, айцец Сава, канешне, разумны чалавек, але ж я пайду да іншага. Таму, што той не такі адукаваны, а значыць, у ім больш благадаці». Вось як лічаць некаторыя: чым менш ты ведаеш, чым горш адукаваны, тым больш благадаці. Святар — як апарат з благадаццю. І, каб не перашкаджаць благадаці ўнутры накоплівацца, трэба менш ведаў, менш культуры. Ёсць такі запыт у людзей, і з гэтым трэба нешта рабіць.

### Вопыты з оптыкай

Мне здаецца, што важна асвойваць новыя жанры і размаўляць з людзьмі на сучаснай мове. Гэта тое, што я спрабую рабіць у сваіх кніжках. Часам выконваю такое практыкаванне, якое называю «змяніць оптыку». Гляджу, напрыклад, на богаслужэнне вачыма святара, а потым — вачыма чалавека, які толькі зайшоў у царкву і нічога там не разумее. Уяўляеце: выходзіць святар чытаць пропаведзь. Мы, царкоўныя людзі, чуем прывычную для нас манеру размовы, успрымаем пропаведзь як частку рытуалу: калі не важны яго змест, а сэнс часта не даходзіць. Калі я «пераключаю оптыку», — бачу проста пафаснага мужчыну з барадой, які гаворыць штампамі. Пры тым, што ён кажа вельмі правільныя рэчы. Але з-за таго, што ён карыстаецца збітымі выразамі, сутнасць пропаведзі губляецца. Менавіта таму трэба шукаць новае маўленне і новы стыль узаемаадносін.

### Абутак для святара

Часам чую: «Бацюшка, а ці можна з вамі вітацца «Добрай раніцы»?» Са святаром не ведаюць, якім чынам мець стасункі. Ён — як фальклорны персанаж. Нядаўна я ішоў па парку, дзе падлеткі гулялі. Раптам чую дыялог:

— Лена, глядзі, бацюшка ў красоўках!

— Такога быць не можа!

— Паглядзі!

Для школьніц гэты факт — святар у зімніх цёплых красоўках — выклікаў шок. Усё з-за таго, што ў грамадстве ёсць пэўны стэрэатып, і нельга выходзіць за яго межы. Мы павінны перыядычна выходзіць з заезджаных формаў, таму што яны перашкаджаюць данесці самае галоўнае. Для мяне богаслужэнне — гэта адкрыццё прыгажосці Бога. Важна разумець богаслужэнне, успрымаючы яго не як нешта рытуальнае, а адчуваючы ўнутраны рытм і прыгажосць. Дарэчы, гэта дапамагае выхаваць эстэтычны густ.

### Як стаць духоўным?

Мы блытаемся пастаянна паміж дзвюма «духоўнасцямі»: у свецкім разуменні (этычным) і духоўнай анталогіяй у праваслаўным разуменні. Гэта балючыя пытанні, звязаныя з духоўным развіццём. Мяне радуе, што пытанні самаразвіцця сталі цяпер актуальныя сярод моладзі. Гэта пытанні выхавання сябе ў пэўным рэжыме, пытанні самаідэнтыфікацыі, перабудовы сябе. Калі чалавек не паставіць сябе на падмурак універсальнай духоўнасці, ён не здольны будзе ўспрымаць духоўнасць царкоўную, духоўнасць праваслаўную. Калі ты не навучышся быць шчодрым, праўдалюбівым, рашучым, смелым (а гэта ўніверсальныя рэчы), табе вельмі складана будзе навучыцца тым дабрадзейнасцям, пра якія пішуць святыя айцы. Тым больш, што апошнія датычацца часта толькі манаскіх духоўных практыкаванняў.

### Жорсткасць пад прыкрыццём Евангелля

У нас атрымліваецца не толькі блытаніна, але і крывадушнасць. З-за таго, што мы адмаўляемся ад універсальнай этыкі, арыентуемся на манаскую лексіку і часам абгрунтоўваем нашы дрэнныя ўчынкі цытатамі са святых айцоў і нават Свяшчэннага Пісання. На пытанні: чаму вы тэрарызуеце сваю жонку, чаму ў вас дзеці жывуць у страху, мне адказваюць: «Таму, што я жыву згодна з Пісаннем. Яны павінны жыць у паслухмянстве». І цытуюць: «Жонка павінна баяцца свайго мужа». Ідэя паслухмянства — адна з самых высокіх, тонкіх дабрадзейнасцяў, якія мы сустракаем у тэкстах святых айцоў. Але ж, няправільна зразумелая, яна прыводзіць насамрэч да жудасных трагедый. Не толькі ў праваслаўных сем'ях, але і ў манастырах. Таксама і ідэя пакоры. Я неаднаразова сутыкаўся з тым, што, напрыклад, чалавеку не плацяць заробак, а пры гэтым кажуць: «Ты ж праваслаўны. Як ты можаш падымаць пытанне пра грошы?» Гэта жудасная спекуляцыя і блюзнерства.

### Еўхарыстыя ці хюге?

Мне падабаецца жыць. І час, у якім жыву, мне падабаецца. Зараз філасофская і багаслоўская думкі зноў вяртаюцца да ісцін простых рэчаў. Цяпер, напрыклад, папулярная філасофія «хюге». Гэта пра тое, як знаходзіць Бога ў невялікіх рэчах. Такіх, напрыклад, як кава ці кветкі. Гэта пра радасць ад прыемных стасункаў ці добрай кнігі. Гэта — пра людзей цудоўных, якія знаходзяцца побач з намі. Гэта ўжо і ёсць сэнс быцця. Не трэба далёка сыходзіць, пагружацца ў філасофію Гегеля ці падымацца ў горы. Проста сустракай Бога там, дзе ты зараз ёсць. Насамрэч гэта ідэя евангельская — ідэя ўдзячнасці, еўхарыстыі (εὐχαριστία — удзячнасць), якая належыць асяродку хрысціянскага светаадчування.

### Ваша гісторыя стане нашай

Я вучуся ў кожнага з вас. Для кожнага дарослага павінна быць уласцівa ўстаноўка пакорлівага вучня. Большасць ідэй для прапаведзяў ці артыкулаў я чэрпаю ў размовах з людзьмі. Таму мне заўсёды прыемна, калі да мяне прыходзяць з глыбокімі пытаннямі. Падыходзьце, пытайцеся. Калі не змагу дапамагчы нейкай парадай — памалюся. Акрамя таго, ваша гісторыя, ваша пытанне, ваш пункт гледжання дапаможа мне бачыць шырэй, разважаць далей, адчуваць глыбей. Мне прыемна, калі вакол людзі, якія шукаюць адказы на складаныя пытанні. Не страчвайце адзін аднаго, не засынайце.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Класныя навіны

# Па відэалекцыі — у анлайн-краму

**Ліцэй БДУ запусціў анлайн-краму адукацыйных матэрыялаў для абітурыентаў.**

Ідэя стварэння платформы http://shop.lyceum.by/ належыць намесніку дырэктара па вучэбнай рабоце ўстановы Ігару Вараксе. Абітурыентам Ліцэя БДУ прапануюцца электронныя адукацыйныя рэсурсы — рэпетыцыйныя выпрабаванні і заданні ўступных экзаменаў, прызначаныя для дыстанцыйнай падрыхтоўкі да ўступных іспытаў у ліцэй. Адзінаццацікласнікі знойдуць там матэрыялы для падрыхтоўкі да ЦТ. Навучэнцам 10-х і 11-х класаў таксама прапануюцца відэалекцыі выкладчыкаў Ліцэя БДУ. У анлайн-краме ёсць матэрыялы па беларускай і рускай мовах і літаратурах, матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, грамадазнаўстве і іншых дысцыплінах. Аўтарамі навучальных дапаможнікаў і электронных адукацыйных рэсурсаў з'яўляюцца выкладчыкі Ліцэя БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


### ЗАО «Белреализация» объявляет о проведении торгов

Публичные торги в электронной форме по продаже имущества в исполнительном производстве (далее – торги) будут проведены **12 февраля 2018 г**., **начало 09.00, окончание 18.00,** на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY.

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. тел.: (8017) 298-53-53, +375 29 690-54-09, e-mail: marketing@zalog.by

| Наименование лота | Начальная цена, бел. руб. | Местонахождение, телефон для ознакомления | Собственник |
|---|---|---|---|
| Автомобиль Toyota Camry, 1991 г. в., белый, рег. знак 0108 АК-3 | 970,00 | г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 131а, +37529 698-53-03 | Земцов А. В. |
| Автомобиль Subaru B9 Tribeca, 2006 г. в., серебристый металлик, рег. знак 0500 ЕС-3 | 12 700,80 | | Ярмолюк И. П. |
| Капитальное строение, инв. №350/С110562, общая пл. – 29,4 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома, одноэтажный бревенчатый дом | 14 500,00 | г. Гомель ул. Рокоссовского, 69, +37529 698-53-03 | Новиков А. И. |

Для участия в торгах необходимо:

1) в срок по **9 февраля 2017 г. до 9.00** перечислить задаток по выбранному лоту в размере 10 % от начальной стоимости лота;

2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY.

Величина первого шага торгов составляет 5% от начальной стоимости лота. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наибольшую цену за лот. Победитель торгов (покупатель) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов. Подробнее на WWW.BELTORGI.BY

Свидетельство о государственной регистрации ИП Германович Е. В., УНП 191031987 считать недействительным в связи с утерей

Считать недействительными утерянные квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) ЗАСО «Промтрансинвест» формы 1-СУ серии СВ №№ 0623731, 0420397.

Утерянные квитанции ЗАСО «Промтрансинвест» формы 1-СУ серии СВ №№ 2284691, 2284692, 2284694, 2284697 считать недействительными.

### РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении открытого аукциона по продаже изолированного помещения, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 35-6

Лот № 1. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798188039, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 35-6, площадь – 85 кв. м, этаж – 4-й. Назначение – квартира, наименование – квартира. Сведения о капитальном строении: инвентарный номер – 500/С-64618, количество наземных этажей – 22–25, количество подземных этажей – 1, год постройки – 2017. Начальная цена продажи – 207 900,00 бел. рублей, задаток 20 790 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

